Б А 46663

Пралятарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

# X
## 1917 1927
# КАСТРЫЧНІК

### ЗБОРНІК ПРЫСЬВЕЧАНЫ ДЗЕСЯЦІГОДЗЬЗЮ КАСТРЫЧНІКАВАЕ РЭВАЛЮЦЫІ

ГОРКІ БССР.
ДРУКАРНЯ АКАДЭМІІ
1 9 2 7

Б А 46663

Пралятарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

# 1917 ДЗЕСЯЦЬ ГАДОЎ 1927

**ВЫДАНЬНЕ КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕНЬНЮ СЬВЯТКАВАНЬНЯ 10-ае ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКАВАЕ РЭВАЛЮЦЫІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ АКАДЭМІІ СЕЛЬСКАЕ ГАСПАДАРКІ**



Сялянскі унівэрсытэт.

1994 г.

# ЗЬМЕСТ

Стар.

1. **Б. Л—н.** 10-цігодзьзе Кастрычнікавае Рэвалюцыі . . . . . . . 1
2. **Рэктар, праф. Козыраў.** Беларуская Дзяржаўная Сельска-Гаспадарчая Акадэмія к дзесяцігодзьдзю Кастрычнікавае Рэвалюцыі . 3
3. **П. В. Саевіч.** Горацкі Рабочы Факультэт . . . . . . . . . 6
4. **П. Паніматка.** Студэнцтва Акадэміі к 10-й гадавіне Кастрычнікавай рэвалюцыі . . . . . . . . . . . . . . . . . 7
5. **І., Н. і К.** Акадэмічная ячэйка КП(б)Б . . . . . . . . . . . 9
6. **Я. Агеяў.** Першы дапаможнік партыі (ячэйка ЛКСМБ Акадэміі) . 11
7. **Бюро СНП.** Дасягненьні Горацкага аддзяленьня Сэкцыі Навуковых Працаўнікоў . . . . . . . . . . . . . . . . . 12
8. **Праф. П. Салаўёў.** Вучот краязнаўчай працы . . . . . . . . 14
9. **А. Вечар.** Маладняк—дзіця Кастрычніка . . . . . . . . . . 16
10. **Яз. Герасімовіч.** Міхась Рудовіч (апавяданьне) (Друкавалася ў газ. „Савецкая Беларусь“ за 1924 г.) . . . . . . . . . . . . . . . . 17
11. **А. Вечар.** Песьні ў Кастрычніку (вершы) . . . . . . . . . 25
12. **Ю. Гаўрук.** Стары матрос (урывак з апавяданьня) . . . . . . 27
13. **А. Аляксеяў.** Напярэдадні (верш) . . . . . . . . . . . . 28
14. **Ўл. Прыбыткоўскі.** *** „Мысьлі нашай вялікі стаж...“ . . . . . 29
15. **Наша грамадзкасьць** . . . . . . . . . . . . . . . . . 30

    I. **П. Кандрацько і В. О. Гурэвіч.** Акадэмія—шэф над вёскай . 30

    II. **К. Шведко.** Дасягненьні падшэфнага Дрыбінскага раёну . . 31

    III. **П. І. Жук.** Праца па ваенізацыі . . . . . . . . . . . 32

---

Горрайлітбел № 38. Зак. № 41 – 1000 экз.

25. 04. 2009

**Б. Л—н**

# 10-цігодзьдзе Кастрычнікавае Рэвалюцыі

Сёньня гісторыя перакладае 11-ю старонку Рабочае Рэвалюцыі, якая пачалася ў Кастрычніку 17-га году.

З пункту погляду „эпохі сацыяльных пераваротаў“, у якую ўступіў, пачынаючы ад Чырвонага Кастрычніка, увесь пралетарскі сьвет—дзесяцігодзьдзе тэрмін невялікі. Але з пункту погляду колькасьці і якасьці здарэньняў за гэты невялікі працяг часу, здарэньняў, якія адбыліся ня толькі у Саюзе Савецкіх Сац. Рэспублік, але і на ўсёй зямной кулі—наш дзесяцігадовы юбілей прадстаўляе з сябе выціск цэлых стагодзьдзяў: ня дзесяць гадоў намі пражыта, а шмат стагодзьдзяў...

Паміж тым, і па гэты дзень з вуснаў нашых ворагаў можна пачуць, нібы „выпадкова“ складзеныя, спрыяючыя да перавароту гістарычныя абставіны, далі магчымасьць бальшавікам захапіць уладу ў свае рукі і падганяць пад яе палітычныя і эканамічныя прадпасылкі сацыялістычнага ладу. Адгэтуль вывад, што ўся гэта штучная бальшавіцкая надстройка павінна рана ці позна рухнуць.

Дзесяцігодзьдзе нашага будаўніцтва і барацьбы ў сусьветным маштабе даюць нам даволі матар'ялу, каб досыць лёгка нізрынуць гэтыя зацьвярджэньні.

Мы далёкі ад думкі спрачацца, што „выпадак“ ніякай ролі не адыграў у справе захапленьня ўлады пралетарыятам у Кастрычніку, але для ўсіх відавочна, што для самага „гістарычнага выпадку“ патрэбны адпаведныя падыходзячыя умовы, як эканамічнага так і палітычнага зьместу: тут і фэодалістычнае падгніўшае самаўладзтва, якое страціла эканамічныя карэньні ў нашым жыцьці, тут і слабая буржуазія, капіталістычныя карэньні якой, наадварот, мала разьвіліся, тут і сялянства, кулацкія элямэнты якога сярод сялянскае беднаты рашаючае ролі адыграць не змаглі, тут і вопыт Рэвалюцыі 1905 году, тут і арганізаваная падпольнай бальшавіцкай партыяй рабочая кляса...

На гэтым толькі грунце „выпадак“, г. зн. паражэньне Расеі ў імпэрыялістычнай вайне мог даць адпаведныя вынікі. Вось у Вэнгрыі, у Баварыі, у Саксоніі, у Фінляндыі і Латвіі той жа „выпадак“ даў рабочай клясе гэтых краін магчымасьць захапіць уладу, але аднак утрымаць гэтую ўладу, на працягу хаця-б аднаго году там не ўдалося. Як відаць акрамя „выпадку“ павінны быць яшчэ аб'ектыўныя умовы, спрыяючыя ўзьнікнавеньню, як самога „выпадку“ так і выкарыстаньню яго ў мэтах сацыялістычнага будаўніцтва.

Якія-ж спрыяючыя умовы садзейнічалі Кастрычніку?

Іх, зразумела, многа. Але затрымаемся на галоўных з іх.

У царскай Расеі, пануючай клясаю былі буйныя памешчыкі, як чужаедная надбудоўка, ня маючая ніякіх эканамічных карэньняў у вытворчасьці. Пры першай хвалі Лютаўскай Рэвалюцыі, гэтая кляса разьлящелася як домік з карт і гісторыя папросту скінула яго са сваіх шчотаў і толькі. Вось адна спрыяючая „выпадку“ умова. Далей к гэтаму часу

зьявіўся на сцэну замест памешчыка-зубра памешчык аграры, за ім кулак, якія скупалі усё болей і болей зямлі і гэтакім чынам утварылі беззямельле і пралетарызацыю вёскі. Гэта другая, спрыяючая „выпадку“ умова. Таксама, к гэтаму моманту зусім сфармавалася аграрная буржуазія і буржуазія вытворчасьці, ня здолеўшая па сваей нявопытнасьці добра зарганізавацца, каб павесьці са сваім клясавым ворагам—моцнай рабочай клясай, пераможную вайну. Пазбаўленая к моманту Кастрычніка, якіх-бы ня было апорных пунктаў у рабочай клясе і ў бедняцкім сялянстве, буржуазія розных колераў павісла ў паветры. Рабочай клясе асталося толькі падрэзаць „паветраную вяровачку“, на якой вісела буржуазія, каб зламаць яе супраціўленьне. Гэта трэцяя умова, якая дапамагла пралетарыяту каб выкарыстаць выпадак. Чацьвёртай спрыяючай умовай было становішча арміі ў эпоху імпэрыялістычнай вайны і пятай—палітычная сьвядомасьць і арганізаванасьць рабочае клясы, саюз з гэтаю клясаю бедняцка-серадняцкага сялянства пад кіраўніцтвам, ідэёва загартаванай у бойках масавай бальшавіцкай партыі.

Дзесяць гадоў Рэвалюцыі, дзесяць гадоў барацьбы і будаўніцтва, ня толькі паказалі, што „выпадак“ толькі палягчыў бурнай рэвалюцыйнай энэргіі, але і паслужыў і служыць цяпер прыкладам для працоўных другіх краёў, уступаючых у паласу сацыяльных пераваротаў.

Чаго мы дасягнулі за гэты працяг часу? Што дало нам і сьвету Дзесяцігодзьдзе Кастрычнікавай Рэвалюцыі?

Яно дало вызвалены з-пад прымусу, гвалту і прыгнечаньня капіталу СССР, роўны 1/6 сьвету. Магутны гаспадарчы і культурны ўздым Саюзу Сав. Сац. Рэспублік пераважае ўздым капіталістычных дзяржаў буржуазнага сьвету, творчыя сілы яго непамерны...

Нарэшце Кастрычнікавая Рэвалюцыя вызвала к жыцьцю III Камуністычны Інтэрнацыянал. Кастрычнікавая Рэвалюцыя ўзгадавала яго і сіламі Ў.К.П. давяла да найвышэйшай ступені разьвіцьця і аўтарытэтнасьці.

Вось дасягненьні к 10-ай гадавіне Кастрычнікавай Рэвалюцыі, з дапамогай якіх мы зрабілі далейшае разьвіцьцё сусьветнай Рэвалюцыі няўхільным і дзякуючы якім мы набліжаем перамогу сусьветнага пралетарыяту, узброіўшы яго нашым вопытам, прыкладамі мінулага, трываласьцю, загартаванасьцю ў перамозе і пераканаваньнем у набліжэньні сацыялізму ўва ўсім сьвеце.

**Няхай жыве 10-цігодзьдзе Кастрычнікавай Рэвалюцыі!**
**Няхай жыве авангард рабочае клясы—Ў. К. П.!**
**Няхай жыве Сусьветны Кастрычнік!**
**Няхай жыве Камінтэрн!**



Фізыка-хімічны будынак С. Г. Акадэміі.

**Рэктар, праф. Козыраў**

# Беларуская Дзяржаўная Сельска-Гаспадарчая Акадэмія к дзесяцігодзьзю Кастрычнікавае Рэвалюцыі

Грунтоўнаю задачай, паўстаўшаю перад ВНУ-мі пасьля Кастрычнікавае Рэвалюцыі, зьявілася задача іх пралетарызацыі.

Беларуская Дзярж. Акадэмія к наступнаму моманту гэтую задачу вырашыла зусім памысна. Студэнцтва Акадэміі ў падаўляючай масе адносіцца па сацыяльнаму становішчу к рабочым і сялянам. Сацыяльны склад студэнцтва за апошнія 3 гады амаль стабілізаваўся і падпадае вельмі нязначным зьменам. Вось даныя за апошнія тры гады.

| | Усяго | Па роду | | Па партыйнасьці | | | Па сацыяльн. становішчу | | | | Па нацыянальнасьці | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Мужчын | Жанчын | Сяброў і канд. КПБ | Сяброў і кандыдат. ЛКСМБ | Беспартыйных | Рабочых | Сялян | Служач. | Іншых | Беларусоў | Расійцаў | Яўрэяў | Палякаў | Іншых |
| На 1/х—25 г. | 1278 | 1135 | 143 | 47 | 145 | 1086 | 174 | 794 | 302 | 8 | 896 | 193 | 179 | 9 | 28 |
| „ 1/х—26 г. | 1391 | 1223 | 168 | 90 | 242 | 1059 | 178 | 824 | 343 | 46 | 956 | 200 | 187 | 15 | 33 |
| „ 1/х—27 г. | 1417 | 1241 | 176 | 141 | 297 | 979 | 180 | 847 | 267 | 123 | 1005 | 166 | 190 | 18 | 38 |

УВАГА: 1) Уграфе „беларусоў" на 1-е кастрычніка—27 г. лічыцца студэнтаўперасяленцаў заходняй Беларусі 43 асобы.
2) Ў графе „іншых" на 1 кастрычніка 27 г. лічыцца студэнтаў наступных нацыяльнасьцяў: украінцаў—17, латышоў—9, ліцьвінаў—7, немцаў—2, мардвоўцаў—2 і эстонцаў—1.

Большасьць студэнцтва па сацыяльнаму становішчу адносіцца к сялянам, што тлумачыцца спэцыяльным ухілам ВНУ. Студэнты-сяляне, галоўным чынам, беднякі і серадвякі.

Даныя табліцы дазваляюць адзначыць таксама зусім памыснае павялічэньне партыйнага і камсамольскага асяродку. На 1/X-25 г.—15%; на 1/X-26 г.—23,6% і на 1/X-27 г.—30,8%.

Па нацыянальнасьці студэнты ў пераважнай колькасьці—беларусы. Гэтая адзнака з году ў год расьце, бо на 1/X-25 г. было 68% беларусаў; на 1/X-26 г.—68,9% і на 1/X-27 г. 70,9%.

Дэкрэтам ураду БССР ад 21 жніўня 1925 году была створана Беларуская Акадэмія, замест існаваўшых раней 2-х Інстытутаў. Гэты дэкрэт узлажыў на нас задачу стварыць больш высокую вышэйшую навучальную установу, чым гэта было раней. Ідучы па шляху вырашэньня гэтае задачы неабходна было паперш за ўсё зьвярнуць вялікую увагу на падбор кадру высока-кваліфікаваных навуковых працаўнікоў. Задача гэтая можна думаць ува многім вырашана, у цяперашні час навуковыя працаўнікі па водзыву кваліфікаванай камісіі адносяцца: 9 чалавек к групе выдатных навуковых працаўнікоў, 33 к асноўнай групе і 80 к групе пачынаючых. Навуковыя працаўнікі, аднесеныя к групе пачынаючых, гэта, галоўным чынам, асыстэнты і асьпіранты. Падбору асьпірантаў прышлося аддаць таксама многа увагі, падбіраючы іх з найбольш здольных і найбольш ідэалягічна блізкіх. Аб гэтым гаворыць рост партыйнага асяродку сярод навуковых працаўнікоў: на 1/X-25 г. сярод. навук працаўн.

было 6,7% партыйцаў і камсамольцаў; на 1/X-26 г.—11,7% і на 1/X-27 г.—21,1%.

Ня гледзячы на яшчэ вельмі нязначныя асыгноўкі дзеля разьвіцьця дасьледчай справы ўсе-ж такі за гэтыя два гады і ў гэтай галіне мы маем даволі значныя посьпехі, аб чым кажуць надрукаваныя навук. працаўнікамі працы, толькі ў адных „Запісках Акадэміі“ надрукавана 61 праца на 70,5 друкаваных аркушах. Апроч „Запісак Акадэміі“ нав. працаўнікі друкавалі свае працы і ў другіх выданьнях. Справе павышэньня кваліфікацыі навук. працаўнікоў, асабліва маладых, бязумоўна дапамагаюць як замежныя так і ўнутраныя навуковыя камандыроўкі.

Патрабаваньне выпуску спэцыялістых больш высокай кваліфікацыі патрабуе таксама стварэньня адпаведных умоў. Тут перш за ўсё прышлося паклапаціцца папаўненьнем абсталяваньня катэдраў, лябараторый і навучальна-дапаможных устаноў. За апошнія 2 гады ў гэтай галіне ўдалося дасягнуць наступных вынікаў. Закуплена замежнага абсталяваньня на 54000 руб. і заказана на 35000. Неабходна адзначыць некаторую наладжанасьць замежных закупак, што вельмі значна дапамагае абсталяваньню габінэтаў і лябараторый Акадэміі.

Ні навуковая праца, ні навучальная ня могуць абыйсьціся бяз добрай бібліятэкі. Бібліятэка Акадэміі ў цяперашні час налічвае 107516 томаў. За апошнія два гады яна набыла 18000 томаў, што трэба прызнаць папаўненьнем даволі значным.

Урэшце дзеля прадукцыйнай працы студэнцтва і навук. працаўнікоў, трэба было паклапаціцца і пра матар'яльныя умовы. У гэтай галіне за 2 апошнія гады нам удалося пабудаваць 3 новых інтэрнаты, плошчаю ў 1718 кв. мэтр., што ў параўнаньні са старою плошчаю дае павялічэньне на 129%; пабудавана для навук. працаўнікоў 5 дамоў, агульнай плошчаю ў 2179 кв. мэтраў, што таксама дае павялічэньне ў параўнаньні са старою плошчаю на 27%; пабудаваны тэатр-клюб з заляю на 820 глядачоў.

Матар'яльнае забесьпячэньне навук. прац. даволі добрае, асабліва групы прафэсароў і дацэнтаў. Стаўка прафэсара—310 руб. у м-ц і дацэнта—240 руб.

Неабходна адзначыць рост акадэмічнай пасьпяховасьці сярод студэнцтва. Калі судзіць па дадзеным аб здачы мінімуму, то гэты рост бязумоўна ёсьць. Па аграфаку здадзены мінімум і максімум на 1/X-26 г. складаў 61,4%, цяпер—86,5%, па земфаку ў мінулым годзе—25,9%, цяпер—44,8%, па мелфаку ў мінулым годзе—31,5%, цяпер—47,8% і па лесфаку ў мінулым годзе—32,7, цяпер—48,7.

Тут нясумненна мы маем уздым пасьпяховасьці, але прызнаць яго добрым мы ўсетакі ня можам. Аб значнай працы студэнцтва можна думаць па спросу на спэцыяльную літаратуру ў бібліятэцы. Гэты спрос зьяўляецца значным.

Галоўным пытаньнем у галіне нацыянальнай палітыкі зьяўляецца пытаньне аб беларусізацыі.

У гэтай галіне мы бязумоўна маем значныя вынікі, ў асаблівасьці сярод малодшай часткі навуковых працаўнікоў. Так, у групе прафэсароў 4 альбо 11,7% вядуць заняткі на беларускай мове (у мінулым годзе 3 асобы—8%). Другая група прафэсароў, галоўным чынам, пры правядзеньні практычных вучэбных заняткаў, карыстаецца беларускай мовай і маецца група прафэсароў, якая вывучае белмову і абяцае ў далейшым перайсьці пакуль што часткова на выкладаньне на белмове.

У групе дацэнтаў мы маем ужо значныя дасягненьні: выкладае на беларускай мове 10 асоб, альбо 59,9%, а ў мінулым годзе—7 асоб, альбо 25%

агульнага ліку дацэнтаў. Астатняя група дацэнтаў праводзіць практычныя заняткі на белмове і можна спадзявацца, што ў новым акадэмічным годзе яны таксама перайдуць на белмову.

Асыстэнты, асьпіранты і лябаранты амаль усе ўладаюць белмовай.

У часьці студэнцтва за апошні год мы таксама напэўна маем некаторыя посьпехі, але ня зусім выстарчальныя.

Беларусізацыя канцэлярыі, бібліятэкі і іншых частак Акадэміі і ўсіх служачых праведзена цалкам на ўсе 100%.

Вялікімі недахопамі, перашкаджаючымі больш шпаркаму правядзеньню беларусізацыі зьяўляецца: адсутнасьць тэрміналёгіі. адсутнасьць падручнікаў па спэцыяльных дысцыплінах, напісаных на беларускай мове. Ненармальнае правядзеньне вучэбных заняткаў па прадметах адчыненай ў пачатку 1926-27 акадэмічнага году яўрэйскай катэдры, у якую ўваходзяць ніжэйпамяненыя прадметы: а) калёнізацыя яўрэяў і б) гісторыя яўрэйскага насельніцтва XIX века, тлумачыцца немажлівасьцю падшукаць сталых выкладчыкаў па гэтай катэдры.



На занятках па грамадазнаўству.

Урэшце, Акадэмія, якая раскінулася сярод вёсак і хутароў, не магла абыйсьці таксама і пытаньня аб уплыве яе на акаляючую сялянскую гаспадарку. Праца ў гэтай галіне вялася ў парадку шэфскае працы навук. працаўнікоў і студэнцтва Акадэміі.

Вясною гэтага году быў адчынен Нядзельны Сялянскі Унівэрсытэт. Інтарэс к якому з боку сялянства выявіўся вельмі вялікім. Запісалася адразу 120 чалавек (меркавалася прыняць усяго 50 чалавек). Адозвы саміх сялян вельмі добрыя.

Пралетарызацыя Акадэміі, яе ўплыў на сялянскую сельскую гаспадарку, правідловае правядзеньне нацыяльнай палітыкі і др., дазваляюць зрабіць вывад, што дадзенае Акадэміі імя „Кастрычнікавае Рэвалюцыі“ яна носіць з гонарам і давер'е учыненае ёй гэтай назваю, яна апраўдвае.

# Акадэмія на расьлінагадоўлі



Расьлінаводны будынак.



Калякцыйны гадавальнік катэдры сэлекцыі ў г./г.

## шляху разьвіцьця
### жывёлагадоўлі



Бык чырвонага беларускага пахаджэньнь на вучэбнай фэрме.



Кныр і сьвіньня буйнае белае ангельскае пароды на вучэбнай фэрме.

**П. В. Саевіч**

# Горацкі Рабочы Факультэт

**Пачаў сваю працу** з 1-га верасьня 1920 г., маючы 65 студэнтаў. Першыя гады (1920/23г .) ён прадстаўляў сабою ня толькі школу, а адначасова і ўзброены атрад для барацьбы з застаўшымся пасьля белапалякаў бандытызмам: дзень — вучоба, ноч — узброеная варта, а часта і шматдзённы паход. Разам са усёю краінай працоўных падымаўся Рабфак да сучаснага становішча, перамагаючы ўсе цяжкасьці. Зараз ён зьяўляецца моцнай вучэбнай установай і с кожным годам паляпшае свае матар'яльнае становішча і ўздымаецца на новую вышыню ў акадэмічных посьпехах.

У апошні год перад Рабфакам пастаўлена **задача:** быць рэчышчам камплектаваньня Горацкай С. Г. Акадэміі. У адпаведнасьці з гэтым пабудован яго плян і вучэбная праграма, якія даюць пераважнае месца прыродазнаўчым дысцыплінам.

Як напрамак, так і **склад студэнцтва** бязумоўна адпавядаюць назве Рабочага факультэту. Амаль увесь склад студэнтаў да паступленьня на Рабфак прайшоў досыць вялікую школу вытворчай і грамадзкай працы на прадпрыёмствах і ў вёсцы і зьяўляецца сапраўды лепшай, перадавой часткай рабоча-сялянскай грамадзкасьці. Аналіз прыёму студэнтаў дае наступны малюнак:

| Год прыёму | Лік прынятых | Па полу | | Па сацыяльнаму становішчу | | | Нацыянальны склад | | | | Партыйн. | | | Сяброў саюзу |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | М. | Ж. | Раб. | Сял. | Служ. | Бел. | Яўр. | Рас. | Інш. | КП(б)Б | ЛКСМ | Бесп. | |
| 1923 | 99 | 76 | 23 | 37 | 48 | 14 | 29 | 23 | 44 | 3 | 25 | 27 | 47 | 75 |
| у %% | 100 | 76.8 | 23,2 | 37,4 | 48,5 | 14,1 | 29,3 | 23,3 | 44,4 | 3,0 | 2,52 | 27,5 | 47,3 | 76,0 |
| 1927 | 73 | 56 | 17 | 44 | 22 | 3 | 56 | 10 | 3 | 4 | 33 | 31 | 9 | 57 |
| у %% | 100 | 43,0 | 60,0 | 58,7 | 33,6 | 60,0 | 43,4 | 52,0 | 100,0 | 66,0 | 84,0 | 36,0 | 30,0 | 78% |
| Агульны склад студэнт. | 226 | 189 | 37 | 106 | 111 | 9 | 183 | 30 | 3 | 10 | 69 | 106 | 51 | 164 |
| у %% | 100 | 85,0 | 15,0 | 46,9 | 49,1 | 3,9 | 81,9 | 12,3 | 1,4 | 4,4 | 37,5 | 41,6 | 20,9 | 72,2 |

Як відаць з гэтага палепшыўся сацыяльны склад, выраўняўся к апошняму году нацыянальны склад, цьвёрдае месца занялі жанчыны, больш пашоў на вучобу партыец і камсамолец і ўзьняўся процант сяброў Праф. Саюзаў.

З прычыны таго, што полем для далейшай працы студэнта зьяўляецца Беларусь, беларусазнаўства павінна заняць і паступова займае адно з асноўных месц. Надворны бок **беларусізацыі** адбіваецца ў наступных даных: з 25 выкладчыкаў ужывае белар. мову і выкладае па-беларуску 20 асоб; з агульнага ліку (300) тыднёвых гадзін вучобы па-беларуску выкладаецца 219 гадзін, альбо 73%,. Для поўнай беларусізацыі выкладаньня (апрача нямец. і рас. моў) нехапае толькі 32 гадзіны, альбо 10,7%; апарат цалкам беларусізаваны. Хоць наогул праходзіць справа беларусізацыі паволі, але-ж укараняецца моцна і зусім небалюча; студэнцтва звычайна заўсёды гутарыць па-беларуску.

**Каштарыс Рабфаку** ўзмацніўся і зараз, хоць у абрэз, але-ж плянава і своечасова можа атрымліваць належныя сродкі і разгортваць работу

Штогодна сумы павялічваюцца: 25 г.—82, 26 г.—88, і 27 г.—95 тыс., Але на кожнага студэнта прыпадае менш: у 26 г. было ўсіх выдаткаў на студэнта (ўключаючы амартызацыю, утрыманьне студ. і вучэбныя выдаткі) прыпадала 440 руб., ў а 26 годзе ўжо дана толькі 410 руб.. Такім чынам, нягледзячы на агульнае палепшаньне умоў працы студэнцтва, дзякуючы больш інтэнсыўнаму скарыстаньню сродкаў, утрыманьне кожнага студэнта на 7% зьнізілася.

З кожным годам паступова ўзрастае якасьць і колькасьць выпускнікоў рабфакаўцаў. Запатрабаваньні ад студэнтаў узьняліся ў паўтара-два разы у сэнсе глыбіні і цьвёрдасьці ўсваеньня і зараз акадэмічны ўзровень сярэдняга выпускніка рабфакаўца бязумоўна вышэй сярэдняка іншай падрыхтоўкі. За мінулыя сем год Рабфак меў 6 выпускаў і даў для вышэйшай школы ўсяго 287 асоб і рыхтуе 8-мы выпуск у ліку 66 асоб.

Год за годам усё мацней і усё большым натоўпам уваходзіць у дзьверы Рабфаку рабоча-сялянская працоўная моладзь. За 200 вёрст пешкі прыходзяць часамі батракі, каб папасьці ў сьцены яго, ледзьве ведаючы простыя лічбы. Упарта, па 13 гадзін у дзень аблізвае ён „граніт навукі“ пакуль не навучыцца яго пастолькі ж гадзін грызьці. Для некаторых гэта сапраўды гэраічная справа.
Мала хто ламае зубы зусім — усяго адсяваецца ня больш 10%—амаль усе даходзяць да канца і кожны імкнецца стаць індустрыялізатарам Савецкага Саюзу.

---

**Няхай жыве навука, якая служыць пралятарскай рэвалюцыі! Няхай жыве пралятарская рэвалюцыя, якая забясьпечвае сапраўдны росквіт навукі!**

---

**П. Паніматка**

## Студэнцтва Акадэміі к 10-й гадавіне Кастрычнікавай Рэвалюцыі

Вялікі сацыяльны пераварот у нашай старонцы, які адбыўся ў Кастрычніку 1917 г., паставіў грунтоўнае пытаньне аб пралетарызацыі вышэйшай школы.

Асноўнае значэньне пралетарызацыі вышэйшай школы ў тым, каб шырока адчыніць яе дзьверы для рабочай і сялянскай моладзі, падрыхтаваць з гэтай моладзі навуковы кіраўнічы кадр і працаўнікоў сацыялістычнага будаўніцтва, якія змогуць наладзіць сувязь вышэйшай школы з тэмпам сучаснага жыцьця, інакш кажучы, паставіць вышэйшую школу ў умовы абслугоўваньня рабочай клясы.

Першае пяцігодзьдзе пасьля Кастрычніка вызначылася вялікай клясавай барацьбой і ў гэты час ня было ніякай магчымасьці прыступіць да перабудовы на пралетарскі лад вышэйшай школы. Толькі з 1922-23 г. рабочая кляса непасрэдна распачала перабудову вышэйшай школы ў СССР. У некаторых ВНУ Масквы і Ленінграду быў арганізаваны „саюз пролетарскага студэнцтва“ які зьявіўся штурхачом для расслаеньня сту-

дэнцтва. У сакавіку 1923 г. ў б. Горацкім С.-Г. Інстытуце таксама ўтварыўся саюз пралятарскага студэнцтва, асноўным ядром якога былі студэнты рабфаку (140 чал.) і студэнты Інстытуту (104 чал.) з агульнага ліку студэнтаў Інстытуту ў 639 чал. Гэтай маладой арганізацыі з 244 асоб у самым пачатку свайго існаваньня давялося вытрымаць шалёную атаку з боку большай, кулацка-буржуазна-інтэлігенцкай рэакцыйнай часткі студэнцтва. Але-ж ня гледзячы на перашкоды з боку рэакцыйнага студэнцтва, саюз пралятарскага студэнцтва хутка ўзмацніўся, пашыраючы сваю працу з вялікім посьпехам.



На занятках па беларусазнаўству.

Позная арганізацыя саюзу пролетарскага студэнцтва ў Інстытуце і непрыхільныя адносіны рэакцыйнай часткі студэнцтва супроць гэтай арганізацыі тлумачыцца тым, што ў Інстытуце быў значна вялікі процант студэнтаў з дробна-буржуазнай і кулацкай масы. Наступная табліца паказвае розьніцу паміж сацыяльным складам студэнцтва 1923 і 1927 г.г.:

| | Усяго студэнтаў у 1923 г. 639 ч. | | | | | | | Усяго студэнтаў у 1927 г. 1417 ч. | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Рабочых і іх дзяц. | Сялян і іх дзяцей | Служачых | Саматужнікаў | Непрацоўны элемэнт | Сяброў і кандыд. партыі | КСМ | Рабочых і іх дзяц. | Сялян і іх дзяцей | Служачых | Саматужнікаў | Непрацоўны элемэнт | Сяброў і кандыд. партыі | КСМ |
| | 28 | 332 | 166 | 12 | 101 | 10 | 15 | 180 | 847 | 305 | 60 | 25 | 141 | 297 |
| у% | 4,3 | 51,9 | 26 | 1,9 | 15,9 | 1,5 | 2,3 | 12,7 | 59,8 | 21,1 | 4,2 | 1,7 | 9,9 | 20,9 |

**З гэтай табліцы відаць, што за 4 гады процант рабочых, сялян членаў КПБ і КСМ значна ўзрос і зьяўляецца яскравым адказам на пытаньне аб пралетарызацыі нашай Акадэміі.**

Матар'яльная забясьпечанасьць у параўнаньні з 1923 г., значна палепшылася, але, вядома яшчэ не зьяўляецца зусім здавальняючай. У 1923 годзе з 639 асоб студэнтаў стыпэндыю атрымлівалі 174, што складае 27%. Было забясьпечана інтэрнатамі 108 асоб (каля 16%) У 1927 г., к 10-й гадавіне Кастрычніка мы маем 896 (каля 65%) стыпэндыятаў; забясьпечана інтэрнатамі 662 студэнты (каля 48%).

Да арганізацыі саюзу пролетстуда, студэнцтва амаль ня вяло ніякай грамадзкай працы ні ў Інстытуце ні ў вёсцы. За апошнія 4 гады студэнцкія арганізацыі распачалі шырокую працу як у Акадэміі, так і наогул сярод працоўнага насельніцтва. У сучасны момант па вёсках працуе каля 368 студэнтаў; у розных грамадзкіх арганізацыях:Мопр—409, Асоавіахім 603, П. Н.—98 асоб, у розных студэнцкіх гуртках прымае удзел каля 770 асоб.

Падагульваючы зусім коратка становішча, жыцьцё і працу студэнцтва, можна сказаць, што лёзунг Кастрычнікавай рэвалюцыі—„Пралетарызацыя вышэйшай школы, яе заваёвы і выпуск новага спэцыяліста „грамадчыка“, зусім рэальна ператвараецца ў жыцьцё і праводзіцца гістарычна бязьмежна шпарка.

У далейшым пад непасрэдным кіраўніцтвам Камуністычнай партыі, гэтыя лёзунгі студэнцтвам Акадэміі будуць выкананы да канца.

**І., Н. і К.**

# Акадэмічная ячэйка КП(б)Б

У гэтым вельмі кароткім артыкуле, прысьвечаным Х-й гадавіне Кастрычнікавай Рэвалюцыі, мы хочам у самых агульных рысах адзначыць галоўныя моманты разьвіцьця і працы акадэмічнае ячэйкі КП(б)Б. Вядома, што ўсё жыцьце і праца ячэйкі КП(б)Б цесна зьвязана з утварэньнем і жыцьцём самой Акадэміі, бяручы свой пачатак з існаваньня б. Горацкага Сельска-Гаспадарчага Інстытуту. Каля году пасьля арганізацыі Інстытуту па ініцыятыве асобных партыйцаў і дапамозе вышэйшых парторганізацый, 5-га сакавіка 1920 году была арганізавана ячэйка КП(б)Б лікам у 5 чал. частка з якіх і зараз актыўна працуе ў Акадэміі (Ліпкін Б. Я. і інш.) З гэтага часу ячэйка пачынае вакол сябе аб'яднаць усё што было лепшага ў той час сярод студэнцтва, імкнецца к будауніцтву і кіраўніцтву жыцьцём Інстытуту і тады ж пачынаецца рост і жыцьцё ячэйкі, які ў першую пару ідзе вельмі шпарка, напрыклад: у сакавіку ячэйка налічвала 5 асоб, у траўні—24 і ў кастрычніку—таго-жа году—27 асоб, частка з якіх была паступіўшыя рабфакаўцы—партыйцы. Вядома, з працягам часу удзел ячэйкі ў жыцьці Інстытуту павялічваецца, але быў вельмі нязначным. Глеба дзеля росту ячэйкі ў той час была кепская, бо большасьць студэнцтва была выхадцамі з варожых пралетарыяту клясаў (дзеці купцоў, паноў, моцных кулакоў і інш.), а таму рост ячэйкі за лік студэнцтва быў хутка спынен. Навуковыя працаўнікі часткова трымалі нэйтральныя пазіцыі к ячэйцы, а частка была настроена варожа і удзелу ў ячэйцы і жыцьці яе ня прымала.

За тое Рабфак з кожным годам даваў усё большы і большы лік партыйцаў за лік якіх галоўным чынам і расла ячэйка. Трэба адзначыць, што самым лепшым прыёмам на Рабфак—быў прыём 1922 году, калі Партыя пачала накіроўваць партыйцаў на вучобу. Гэты год даў значны лік таварышоў, сярод якіх была частка больш старэйшых партыйцаў і ад-

казных працаўнікоў (Галадзед Н. М. і інш.). Пасьля гэтага прыёму ячэйка налічвала 66 асоб, з якіх сяброў партыі—49 і кандыдатаў—17.

З 1922 году удзел ячэйкі ў будаўніцтве і кіраўніцтве Інстытуту, а потым Акадэміі, з кожным годам павялічваецца ўсё больш і больш, а зараз ячэйка КП(б)Б разам з лепшай часткай навуковых працаўнікоў і студэнцтва прымае самы шчыры і самы актыўны удзел у будаўніцтве і жыцьці Акадэміі.

Трэба адзначыць яшчэ адзін вельмі важны момант у разьвіцьці ячэйкі, гэта ўступленьне ў шэрагі яе лепшай часткі рабочых Акадэміі і ўтварэньне вытворчага парткалектыву. у час Ленінскага заклікуў 1924 г.

Зараз гэты калектыў налічвае 25 асоб, з якіх—14 рабочых занятых ў вытворчасьці. Т. т. сябе як партыйцы поўнасьцю апраўдалі, частка з іх ужо высунута на адказную працу. Такім чынам к Х-й гадавіне Кастрычнікавае Рэвалюцыі, ячэйка КП(б)Б. вырасла і налічвае 231 асобу, з якіх 114 сяброў партыі і 117 кандыдатаў, сярод якіх маецца 16 жанчын. Па роду заняткаў, склад ячэйкі дзеліцца наступным: студэнтаў—80,7%, навуковых працаўнікоў—84% і служачых—2,5%. Сярод партыйцаў кожны год праводзіцца сталая партвыхаваўчая праца: сярод студэнтаў і навуковых працаўнікоў-партыйцаў шляхам гурткавых заняткаў, а сярод рабочых і служачых, шляхам уцягненьня іх у партыйную школу.

Ячэйка наогул моцная, ленінска-спаяная і палітычна падрыхтаваная.

Добры удзел ячэйка прымае ў працы прафэсыйных і грамадзкіх арганізацый Акадэміі, аб чым сьведчыць наступнае:

1) Амаль-што 100% партыйцаў—сябры Прафсаюзаў.

2) У грамадзкіх арганізацыях АСОАвіяхіму, МОПР, Шэфск. Т-ва прымае удзел 220 партыйцаў, з якіх 13 асоб на кіраўнічай працы гэтых арганізацый.

3) 100% навуковых працаўнікоў-партыйцаў зьяўляюцца сябрамі Сэкцыі Навуковых Працаўнікоў, з якіх 3 асобы на кіруючай працы Бюро Сэкцыі Навуковых Працаўнікоў.

4) Таксама сябры ячэйкі састаяць у шэрагу розных гурткоў, зьяўляюцца кіраўнікамі, выкладчыкамі ў розных гуртках і г. д.

Акрамя прафэсыйнай грамадзкай працы, значны удзел прымае ячэйка ў працы Праўленьня Акадэміі, і ў працы навуковых устаноў Акадэміі і Рабфаку. Няма ніводнае прадметнае камісіі і дэканату, дзе б партыйцы, у тэй ці іншай меры, ня прымалі ўдзелу у працы гэтых арганізацый, недапамагалі-б будаўніцтву Акадэміі і ў наладжваньні яе жыцьця.

Адзначаючы гэтыя галоўныя моманты ў жыцьці і працы ячэйкі КП(б)Б, мы цьвёрда ўпэўнены ў тым:

1) Што ў далейшым рост ячэйкі будзе працягвацца за лік лепшай больш адданай справе пралетарыяту і будаваньню сацыялізму ў нашым Саюзе, часткі студэнцтва, ў першую чаргу прайшоўшых праз Камсамол.

2) Шляхам узмацненьня партвыхаваўчае працы сярод партыйцаў, побач з добрай падрыхтоўкай іх як спэцыялістых у сельскай гаспадарцы, мы зможам падрыхтаваць належных барацьбітоў за перабудову нашае вёскі ў сацыялістычным напрамку.

3) Ячэйка КП(б)Б разам з лепшай часткай навуковых працаўнікоў і студэнцтва ў пачатку другога дзесяцігодзьдзя Кастрычнікавае Рэвалюцыі зможа зьнішчыць тыя недахопы, якія маюцца ў будаўніцтве Акадэміі і ў яе ўнутраным жыцьці.

**Жалезная дысцыпліна нашай партыі - аснова дыктатуры пралетарыяту**

**Я. Агеяў**

# Першы дапаможнік партыі
## (Ячэйка ЛКСМБ Акадэміі)

Сьвяткуючы 10-ю гадавіну пралетарскай рэвалюцыі студэнтам патрэбна кінуць погляд, хаця-бы ў самых агульных рысах на свой перадавы атрад студэнцкай моладзі—камсамольскую ячэйку.

Яна арганізавана 23 красавіка 1921 году з 6 чалавек. З кожным годам ячэйка расла як арганічна—за лік прыймаемых студэнтаў у камсамол, так і мэханічна—за лік паступаючых камсамольцаў у Горы-горацкі Інстытут. У 1924 годзе ячэйка налічвала 121 чал., а ў 1925 г. пасьля ўтварэньня сэрца с. г. культуры Беларусі—С. Г. Акадэміі ў выніку зьліяньня Менскага і Горы-горацкага С. Г. Інстытутаў ужо налічвалася 261 чал. У сучасны момант сяброў і кандыдатаў ЛКСМБ у ячэйцы маецца 395 асоб. З іх:

По полу

Хлапцоў 340 чал. ці 86% — Дзяўчат 55 чал. ці 14%

Па сацыяльнаму становішчу

Рабочых 122 чал. ці 30,9% — Сялян 225 чал. ці 56,9%

Іншых 48 чал. ці 12.2%

Па нацыянальнасьці

Беларусоў 300 чал. ці 75,9% — Яўрэяў 49 чал. ці 12,4%

Расейцаў 31 чал. ці 7,8% — Іншых нац. 15 ч. ці 3,9%

**Асноўныя моманты жыцьця і працы**. Кожны камсамолец, адпаведна сваім сілам і здольнасьцям, разам з вучобай нясе тую ці іншую грамадзкую нагрузку, якая дапамагае яму быць больш разьвітым, больш сьвядомым чалавекам. У гэтым годзе таксама ставіцца задача—даць нагрузку ўсім камсамольцам акрамя акадэмічна адстаючых. Як факт трэба адзначыць, што камсамольцы на фронце вучобы стаяць наперадзе! Маюцца камсамольцы асьпіранты.

Акрамя падвышэньня свайго палітузроўня па лініі вывучэньня грамадзка-палітычных дысцыплін па акадэмічнаму пляну ўтворана 10 камсамольскіх палітгруп бягучых пытаньняў, дзе вывучаюцца асноўныя пытаньні бягучай палітыкі партыі і савецкай улады, таму што згодна статуту ВЛКСМ п. 16 „Камсамолец павінен ведаць задачы партыі і савецкай улады, сачыць за асноўнымі палітычнымі здарэньнямі ў СССР і др. дзяржавах і перадаваць свае веды астатняй моладзі і ўсім працоўным".

Зараз ячэйка наогул прадстаўляе адзіную камсамольскую сям'ю маючую адны мэты і задачы ў сваім жыцьці. Няма ніякіх склок, грубых разыходжаньняў і парушэньняў камсамольскай дысцыпліны, хоць маюцца асобныя выпадкі неразуменьня і падрыву дысцыпліны ячэйкі. Ну што-ж! „У вялікай сям'і не бяз вырадка" кажа народная прыказка.

Балючае пытаньне ў ячэйцы з камсамольцамі-пераросткамі. Усяго пераросткаў (1904 г. н. і старэй) налічваецца 119 чал., што складае 30,1%. Партасяродак сярод пераросткаў 56,3%. Некаторыя камсамольцы маюць кепскія настроі і нават варожыя ў сувязі з адсутнасьцю пэрспэктыў дзеля перадачы іх у КПБ. Гэтыя т. т. не разумеюць, альбо забываюць, што і пасьля мэханічнага выбыцьця з КСМ кожны сацыяльна-падыходзячы

да партыі, праявіўшы сябе на грамадзкай працы, даказаўшы, сваю адданасьць партыі, зможа пастуціць у яе шэрагі альбо застацца беспартыйным актывістам.

**Далейшыя задачы** наступныя: даць кожнаму камсамольцу нагрузку па яго жаданьню і сіле і сачыць за яе выконваньнем; павялічыць партасяродак за лік выяўленых на грамадзкай працы і палітычна падрыхтаваных камсамольцаў, больш камсамольцаў уцягнуць у сябры Асоавіяхіму і яго працу, як аснаўной арганізацыі ваенізіруючай насельніцтва для таго, каб быць заўсёды гатовым, з вайсковымі ведамі і ўменьнем, стаць на забарону Кастрычнікаўскіх заваёў ад нападу капіталу. Узмацніць палітвыхаваўчую і масавую працу.

У першыя гады стварэньня ячэйкі рэвалюцыйны энтузіязм камсамольцаў студэнтаў быў накіраван на дапамогу партыі. У барацьбе з бандытызмам кніга часта замянялася вінтоўкай і наганам.

Зараз наша галоўная задача—**вучоба** разам з грамадзкай працай дзеля таго, каб быць добрым спэцыялістым у сацыялістычным будаўніцтве, але мы павінны быць гатовымі ў любы момант к надыходзячай рашучай бойцы капіталу з працай.

Ячэйка была, ёсьць і будзе першым і верным дапаможнікам партыі у яе творчай працы па пабудове сацыялізму ў нашай краіне.

---

## У дзесятую гадавіну Кастрычніка Ленінскі Камсамол яшчэ вышэй падымае сьцяг Леніна, сьцяг пралятарскай рэвалюцыі, сьцяг вызваленьня ўсіх прыгнечаных

---

**Бюро СНП**

## Дасягненьні Горацкага аддзяленьня Сэкцыі Навуковых Працаўнікоў

Прафаб'яднаньне навуковых працаўнікоў у Горках, арганізацыйна афармленае ў Горацкае аддзяленьне Сэкцыі Навуковых Працаўнікоў існуе з 1922 году. Яго склад хістаўся ад 38 чалав. да 127 чал., на І/х-1927 г. у СНП лічыцца 122 сябры.

Сэкцыя Н. П. прарабіла значную культ-асьветную працу, дапамагала ў акадэмічным будаўніцтве Вышэйшае Сельска-Гаспадарчае Школы на Беларусі і мела шмат інш. дасягненьняў у сваей працы, што давала магчымасьць лічыць яе аднэй з лепшых у СССР.

Галоўную увагу Сэкцыя зьвяртала на культ-асьветную працу, якую неабходна падзяліць на 2 часткі: унутраную працу сярод навуковых працаўнікоў і масавую працу па Беларусі наогул, а ў прыватнасьці па Аршаншчыне.

Павышэньне грамадзка-палітычнага ўзроўню і навуковай кваліфікацыі дасягалася працаю гурткоў, аб'яднаньняў, сходаў і камісій унутры сэкцыі.

Асяродкам гэтае працы, як і ўсяе працы, быў клюб-чытальня СНП. нягледзячы на нездавальняючае памяшканьне і абсталяваньне.

У 1927 г. Савет Народных Камісараў БССР адпусьціў на палепшаньне Клюбу СНП—2000 руб., на якія Клюб грунтоўна абсталяваны і пашыраны. Адчыненьне яго адбываецца ў дзень Х-ай гадавіны Кастрычнікавай Рэвалюцыі і дае магчымасьць шырока разгарнуць культурную працу і паглыбляць яе.

Мясцовыя умовы жыцьця асабліва спрыялі разьвіцьцю культ-асьветнае працы сярод сялянства і сябры СНП прымалі самы шырокі удзел ў гэтай справе. Па няпоўнай рэгістрацыі, сябрамі СНП было прачытана для розных грамадзкіх арганізацый і устаноў шмат цыклявых і эпізадычных лекцый.

У 1924 г. (да I/X) прачытана 80 лек., 1925 г. 93 лек., 1926 г. 75 л., і ў 1927 г. 81 лекцый.

Сябры СНП заўсёды прымалі удзел у правядзеньні шэрагу с/г і інш. курсаў і працуюць у шэф-таварыстве Акадэміі.

Апрача таго ўжо другі год СНП са свайго каштарысу ўносіць па 25 руб штомесячна ў шэф-таварыства.

Да арганізацыі таварыства СНП вяла самастойную шэфскую працу на вёсцы, распачатую ў 1923 г. у 1924 г. у падшэфнай СНП вёсцы „Буда“ была адчынена на сродкі СНП хата-чытальня, якая была пераведзена пасьля ў вёску „Кацелева“ і набыла раённае значэньне. Сябры СНП езьдзілі туды чытаць лекцыі.

У 1925 г. у вёсцы „Задарожжа“ сіламі сэкцыі была арганізавана і адчынена школа, якая была абсталяна на сродкі СНП, прычым сэкцыя аплачвала працу і выкладчыка школы.

Цяпер гэта школа перайшла на дзяржаўны бюджэт. У 1926 годзе Горацкае адзяленьне СНП арганізавала шэраг выяздных лекцый па акруговых гарадох Беларусі і аплачвала іх па 25 руб. кожную з свайго каштарысу.

У 1927 г. сэкцыя распрацавала пытаньне аб арганізацыі Сялянскага Унівэрсытэту і 1-ага мая г/г. быў урачыста адчынены ў Горках, першы ў СССР Сялянскі Унівэрсытэт, у якім вучыцца дармова болей 100 чал. сялян. Гэты Унівэрсытэт набыў вялікую папулярнасьць сярод працоўнага сялянства Саюзу Рэспулік і паміж розных грамадзкіх арганізацый.

Прыклад Горацкага аддзяленьня СНП пераймаюць іншыя адзяленьні і ў Волагдзе ўжо таксама адчыніўся Сялянскі Унівэрсытэт.

Гэтая праца СНП спрыяла ўзмацненьню сувязі Акадэміі з краем, а на парозе Дзесяцігодзьдзя Кастрычнікавае Рэвалюцыі Горацкае аддзяленьне Сэкцыі Нав. Прац. стаіць перад новымі і больш шырокімі заданнямі паглыбленьня сваё працы.

Толькі пралятарская рэвалюцыя забясьпечыла сапраўдны ўздым культурнага і матар'яльнага ўзроўню працоўных мас.

Няхай жыве сацыялістычная культура!

**Праф. П. Салаўёў**

# Вучот краязнаўчай працы

Дзесяцігадовы пэрыяд (1917—1927), на працягу якога Сьцяг Кастрычнікавай Рэвалюцыі пераможна і нязьменна чырванее над неагладнымі абшарамі Усходняй Эўропы Паўночнай і Цэнтральнай Азіі, складае буйнейшую эпоху ў гісторыі разьвіцьця сацыялізму. „Сацыялізм—гэта вучот“. Гэтыя словы Леніна з асаблівай сілай былі падкрэсьлены на першай канфэрэнцыі краязнаўчых таварыстваў у Маскве ў 1921 годзе. Гэтыя-ж словы зусім сваечасова ўспомніць цяпер, калі падагульваецца дзесяцігадовае будаўніцтва на ўсяму Савецкаму Саюзу. У разьвіцьці краязнаўчай справы пасьля вышэй памянёнай канфэрэнцыі трэба адзначыць заснаваньне ў 1922 годзе Цэнтральнага Бюро Краязнаўства, якое, працуючы спачатку адначасова ў Маскве і Ленінградзе, канчаткова асталявалася ў Ленінградзкім Ц. Б. К. РСФСР. Па гэтым ствараюць свае Цэнтральныя Бюро УССР. і БССР. На Беларусі Ц. Б. К. пачало сваю працу пры Інбелкульце, арганізаваным у 1920 годзе. Разам з працай ЦБК Дзяржплян склікае ў 1923 годзе Ўсерасійскую Канфэрэнцыю па Вывучэньню Вытворчых Сіл краіны, адкуль пачынаецца так званы КЕПС. Фармальна рост краязнаўчай справы ў 1923 годзе выяўляецца існаваньнем 297 краязнаўчых таварыстваў. У 1924 г. склікаецца ў Маскве другая краязнаўчая канфэрэнцыя, якая падагульвае зробленае і вызначае асноўныя этапы далейшага разьвіцьця і тэй плянавай працы, якая вядзецца і цяпер. У тым жа годзе у нас у Горках заснавалася Горацкае раённае таварыства краязнаўства. Ў Менску ў 1926 г. ЦБК пачынае выдаваць свой орган „Наш Край“. Такім чынам, на Беларусі з самага пачатку існуюць два цэнтры: на захадзе—Менск з Інстытутам Бел. Культуры і ЦБК, на ўсходзе—Горы-Горкі з Беларускай С.-Г. Акадэміяй.

Менскае ЦБК ўжо выпусьціла 22 нумары сваёй часопісі, ня лічачы непэрыядычных выданьняў. Да 1-га студзеня 1927 г. ў ЦБК зарэестравалася 302 краязнаўчых арганізацый. Па ўсяму СССР, разам з БССР, па даведніку Ленінградзкага ЦБК 1925 г. налічвалася 1303 краязнаўчых арганізацый. Краязнаўчыя арганізацыі БССР да 2-га Ўсебеларускага Зьезду (10 - 13 лютага 1927 г.) складалі 7073 сяяры, а разам са школьнымі арганізацыямі 9389. У гэтым ліку партыйцаў—10,4% і камсамольцаў — 9%. Рабочых і сялян удзельнічае 5%. Лік раённых краязнаўчых музэяў азначаецца лічбай 16.—ЦБК ў наступных словах характарызуе стан краязнаўчай справы ў БССР: „За апошнія гады назіраецца надзвычайна шпаркі рост краязнаўчых арганізацый і ажыўленьне краязнаўчай справы. Чым далей, краязнаўчы рух набывае ўсё больш грамадзкі характар; чым далей, у гэтую справу ўцягваюцца ўсё больш шырокія масы працоўных. За мінулы год лік членаў краязнаўчых арганізацый павялічыўся на 100%. Гэта відавочна сьцвярджае выказаную ня раз краязнаўцамі думку, што краязнаўства ёсьць дзіця рэвалюцыі. Трэба толькі дадаць—Кастрычнікавай. Бо толькі Кастрычнікавая рэвалюцыя, якая абудзіла шырокія працоўныя масы, толькі пралятарская рэвалюцыя, высунуўшая лёзунг аб пабудове сацыялізму, дзякуючы правільнаму ідэёваму кіраўніцтву Камуністычнай партыі, магла выклікаць гэтую агульную зацікаўленасьць да вывучэньня жыцьця мас і умоў іх працы“ (працы другога Ўсебел. Краязн. Зьезду 1927 г.). Апроч ЦБК і сам ІБК у значнай ступені ў сваіх сэкцыях і камісіях вядзе наперад краязнаўчую справу.

У Горы-Горках краязнаўчая праца вядзецца Беларускай С.-Г. Акадэміяй: у Навуковым Т-ве па вывучэньні Беларусі (сэкцыя Інбелкульту) і ў раённым таварыстве краязнаўства. Дзякуючы супольнай дзейнасьці гэтых Горацкіх установ і іх працаўнікоў, выпушчаны шэраг друкаваных прац краязнаўчага зьместу. Усяго такіх прац: 12 гістарычных, 72 агранамічных, 32 па лесагадоўлі, 21 па мэліарацыі і землябудаўніцтву і 65 прыродазнаўчых. Навуковае Т-ства ў час заснаваньня ў 1925 г. налічвала 85 членаў, з якіх 15 былі членамі ІБК. У сучасны момант яно складаецца з 115 членаў, з якіх 22 — члены ІБК. Навуковым Т-вам у першы год існаваньня заслухана 15 навуковых дакладаў. На другі год заслухана 57 дакладаў. Разгарнулася праца ня толькі стацыянарная, але і экспэдыцыйная. Т-ва надрукавала 2 тамы сваіх „Прац" і адначасова друкуюцца 3-і і 4-ы тамы, прычым 3-і том прысьвечаны апісаньню Горацкага раёну і матар'ялы для яго напісаны членамі Горацкаго раённага т-ва краязнаўства. Усё гэта зрабілася мажлівым, дзякуючы асыгнаваньню Інбелкультам Навуковаму Т-ву 8300 рублёў. Што тычыцца Горацкага раённага краязнаўчага т-ства, то ў яго склад уваходзяць навуковыя працаўнікі, настаўнікі і студэнты. Лік членаў вагаўся ад 47 да 247. Лік сходаў вагаўся па гадох ад 2 да 7. Лік навуковых дакладаў ад 5 да 16 ў год. За пэрыяд з 1924 да 1927 г. праца была накіравана пераважна на вывучэньне прыроды тутэйшага краю (фаўна, флёра), а часткова і на характарыстыку асаблівасьцяў народнай гаспадаркі. Вяліся ўвесь час фэналягічныя назіраньні. Членамі Т-ва сабрана і адаслана ў ІБК 96 народных песень. Матар'яльныя сродкі вагаліся ад 16 да 85 рублёў у год.

З паданага кароткага нарысу відаць, што краязнаўчая праца пасьля Кастрычнікавай Рэвалюцыі з вучоных габінэтаў і лябараторыяў перанеслася і пераносіцца ў шырокія народныя масы. Таму яна і набыла ўжо грамадзкі рух. Гэты рух расьце і мацнее. У ім узмацняецца той напрамак, які зьвязаны з вывучэньнем эканомікі краю, з вывучэньнем вытворчых сіл краіны. Праца гэта патрэбна для будаваньня сацыялізму. Рацыяналізацыя яе немагчыма бяз плянавасьці і вучоту. Падагульваньне зробленага ў ажываючых абставінах Савецкага Саюзу пасьля вайны, інтэрвэнцый і пад пагрозамі новага зрыву мірнага будаўніцтва з боку ворагаў СССР, дазваляе нам упэўнена заявіць, што жывая справа вывучэньня краіны не замрэ, а нястрымана будзе ісьці далей, наперад па вызначанаму шляху.



Галоўны будынак С. Г. Акадэміі.

# СТУДЭНЦТВА АКАДЭМІІ НА ВУЧОБЕ



На занятках па батаніцы.



На занятках па геалёгіі.

# КУТКІ АКАДЭМІІ



Батанічны сад (уваход і цяпліца)



Лясны вэгэтацыйны домік

**А. Вечар**

# Маладняк—дзіця Кастрычніка

У маі м-цы 1925 году на Аршаншчыне зьявілася першая спроба, першая ластаўка свайго літаратурнага слова, невялічкая часопісь „Аршанскі Маладняк“, выдадзеная Аршанскай філіяй.

Яна зьявілася, як і многія другія, адзнакаю ўздыму абуджанае Кастрычнікаваю Рэвалюцыяй творчае сілы ў той працоўнай моладзі, якая хацела „служыць справе рэвалюцыі, справе перамогі пралетарыяту і сялянства, змагацца з усімі ворагамі рэвалюцыі сродкамі беларускай мастацкай літаратуры для пабудаваньня сацыялістычнага ладу жыцьця“, [1]) якая аддавала Рэвалюцыі свае думкі, настроі і пачуцьці, гэтай проста пастаўленай перад сабою мэце. Ясно адно, што песьні Рэвалюцыі стварылі Ўсебеларускае аб‘яднаньне паэтаў і пісьменьнікаў „Маладняк“, надалі яму моц і аб‘ядналі ў свой час навакол яго ўсё, што было лепшага сярод маладых барацьбітоў на фронце ідэёвага змаганьня.

Сама філія незадоўга перад выданьнем часопісі была арганізавана групаю моладзі ў Воршы, а далей у хуткім часе раскінула сваю працу сярод моладзі С.-Г. Акадэміі, але самым галоўным арганізатарам, які даваў натхненьне і волю да арганізаванай працы была сама Кастрычнікавая Рэвалюцыя.

І сёньня, ў дзесяты год яе разгортваньня ў Сусьветны Кастрычнік, мы бачым, што выдаўшы ўжо 6 №№ сваёй часопісі, якая палепшылася і якасна і колкасьна, Аршанская філія займае не апошняе месца. Яна, як адзначае газэта „Зьвязда“ „мацнейшая пасьля Менску на Беларусі. Аб гэтым сьведчаць апошнія нумары яё часопісі“[2]). Калісьці Аршанская філія з энтузыязмам падносіла ў падарунак старшыні Ц.В.К. СССР т. Чарвякову 3 першых №№ сваёй часопісі, як дасягненьні свае працы. Зараз к 10-му Кастрычніку мае новыя дасягненьні вызначныя ў далейшых трох нумарох з захаваньнем сілы для далейшага разьвіцьця і працы. Але-ж філія займалася не аднэй толькі вытворчай працай. Яна вяла працу ў гуртках Акадэміі, ставіла дыспуты („Голы зьвер“ М. Зарэцкага і др.), вечары (Беларуская народн. лірыка і др.) ня толькі ў Горках, а і ў Воршы, што мае яшчэ большае значэньне таму, што сама філія невялікая. Яна складаецца з 5 асоб, з якіх 2—партыйцы, 1—камсамолец і 2—беспартыйных. Жанчын няма.

Маркс пісаў аб першых творах пралятарскага пісьменьніка Вэйта, што гэта дзіцячыя чаравічкі пралетарыяту, але як яны магутны ў параўнаньні з атоптанымі ботамі буржуазіі. Маладняк, а разам з ім і наша філія — дзіця Кастрычніка, і хоць яго творчасьць толькі дзіцячыя чаравічкі, то ўсеж такі нельга не згадзіцца з тым, што сказаў дзед Маркс. Выгадаваць гэтае дзіця, выхаваць яго ў належным напрамку—задача ўсёй нашай грамадзкасьці. Аршанская філія з свайго боку цьвёрда ведае свае задачы і пастараецца надзеі, якія на яе ўскладаюцца, выканаць. Патэнцыянальныя магчымасьці ёсьць, яе трэба перавесьці ў кінэтычную энэргію сацыялістычнага будаўніцтва. І ў той час, калі вораг захоча заглушыць стук малатоў на будаваньні новага чалавечага ладу, заглушыць у час адпачынку магутныя песьні працы ляскаsuccessьнем кулямётаў і грукам гармат, я упэўнен, што маладнякоўцы ў ліку першых адложаць „ліру“ ў бок і возьмуць у рукі вінтоўку на забарону заваёў парадзіўшай іх Кастрычнікавай Рэвалюцыі.

---

[1]) Адна з рэзалюцый пленуму Ц. Б. Маладняка.

[2]) Ад 28 жніўня г./г. ў арт. „Арш. Маладн. № 6“

**Яз. Герасімовіч.**

# Міхась Рудовіч
## (апавяданьне).

### I.

Быў цёплы заліты сонцам маёвы дзень.

Марына-Горская агранамічная школа танула ў моры зеляніны. Белыя муры школьнага будынку горда выглядалі з-за высокіх ліп і тапалёў, якія агарнулі будынак навакол і рабілі вабны халадок. Уздоўж сьцен расьцягнуўся доўгі бэзавы шнур. Белыя і сьветлаблакітныя гронкі бэзавых кветак пазіралі ў вокна будынку, шчыра разьліваючы навакол свой прыемны пах. Вялікі сад, абліты малаком бела-ружовых пахучых кветак, даваў прытулак сотнямі птушак, якія ад ранку і да заходу сонца шчабяталі на розныя галасы.

У школьным памяшканьні кішэў людзкі муравейнік. У розных кутком былі чутны зыкі: хада па калідору, стук аб школьныя лаўкі, бразг рыдлёвак, матык, звон пасуды на кухні, сьвістаньне, вясёлы рогат.

Студэнты пасьля абеду, пачуўшы званок, разыходзіліся, куды каму прызначыў дзяжурны па гаспадарцы. Адны з іх ішлі слухаць лекцыі, другія на практычныя заняткі, а іншыя працаваць у гарод, сад і на поле.

Малады, прыгожы хлопец-студэнт Міхась Рудовіч пасьля абеду вярнуўся ў сваю спальню і, адчыніўшы свой куфэрак, які выцягнуў з пад ложка, пачаў чагось там шукаць. Ен пачаў выкідаць адтуль розныя паперы на падлогу, пільна разглядаючы іх. На яго твары можна было заўважыць занеспакаеньне. Рух яго быў нэрвовы, відаць было, што ён завіхаецца.

Апроч Міхася ў спальні знаходзілася яшчэ пяць студэнтаў, але здавалася, што ніхто не зьвяртае на яго жаднай увагі. Перабіраў ён усе паперы хвілін дзесяць, пасьля чаго ўзяўшы адложаны жмук паперы, скруціў яе і выйшаў у досыць цёмны карыдор. Тут ён выняў з кішэні шнурок, зьвязаў паперу і моцна кінуў яе на высокую печ-грубку.

Толькі адзін студэнт, які йшоў з другого паверху, бачыў, як мігнулася ў гары папера. Міхась, заўважыўшы гэтага студэнта, сказаў, азірнуўшыся перад гэтым навакол:—здаецца туды на печ ніхто на палезе спадзяюся ніхто ня знойдзе гэтых рэчаў.

— Можа папераў гэтых ніхто і ня знойдзе,—сказаў студэнт, злазячы ўніз па сходках,—а вось нас, браце, могуць знайсьці тут. Ты, паглядзі, усюды пашлі арышты: у Слуцку, у Вузьдзе, у Дукоры. Нас напэўна шукаюць жандары. Рыгор прапануе ўцякаць за Бярэзіну да сваіх, але хлопцы ўтрымліваюцца, бо гэта можа прыкмеціць дырэктар і пачнуцца арышты. Можа здарыцца так, што арыштуюць такіх хлопцаў, якія амаль што нічога і ня ведаюць пра нашу арганізацыю. Я таксама прапаную трохі пачакаць, бо невядома якія весткі прыдуць з Менску.

— Эх, брат Паўлюк!—сказаў глыбока ўздыхаючы Міхась,—Ніякіх вестак з Менску мы больш не атрымаем, бо там ўсе нашы найбольш актыўныя сябры арыштованы. Гэты Квяткоўскі, які ўступіў у нашу арганізацыю і лічыў сябе самым заядлым камуністым, быў ніхто іншы, як польскі шпег. Помню, мне зразу чамусь не хацелася, каб ён блытаўся паміж нас. Я нават нейкі час назіраў за ім, але хлопцы пачалі гаварыць, што баяцца няма чаго, што ён даказаў сваю належнасьць да камунізму тым, што страляў у Ігуменскага старосту, а пасьля гэтага разам з імі раскідаў рэйкі на чыгунцы паміж Рудзенскам і Марына-Горкаю. Я вя-

БА 4663

дома, гэтаму паверыў. Ён падлез да мяне, падлізаўся, сьцібрыў найважнейшыя паперы і больш я яго ня бачыў, а тут зараз пачаліся і гэтыя арышты. Я парашыў заўтра ісьці за Бярэзіну, а вы павінны пакуль што тут пабыць, я вас пасьля паведамлю. Сягоньня а дванаццатай гадзіне зьбяромся ў ліпавай прысадзе, там у кутку. Пагаворым аб далейшых кроках... А цяпер я пайду адпачыць, у ночы мала спаў. Мяне дзяжурны назначыў араць, але я адпрасіўся, сказаў яму, што баліць галава. Ведаю, што дырэктар будзе мне назаляць, будзе пасылаць у бальніцу да фэльчара, але гэта ўсё глупства.

Міхась пасьля размовы з сябрам пайшоў зноў у спальню, лег на ложка і пачаў глыбока думаць. А думаць было шмат аб чым. Ён—кіраўнік цэлае падпольнае арганізацыі, якая ўвесь час дзейнічала супроць бела-палякаў, а ў сучасны момант выкрыта і ў большасьці арыштована. Чакаць больш няма чаго, кожная гадзіна дорага каштуе. Міхась добра ведаў, што яму ў школе далей заставацца нельга, што яго могуць арыштаваць, як і іншых сяброў падпольнай бальшавіцкай арганізацыі. Яму сябры паведамілі, што яго—Міхася Рудовіча, шукаюць польскія жандары.

Ужо дзьве ночы ён не начаваў у спальні, а, ўзяўшы сваю шынелю, ішоў у садзібу, абгароджаную высокімі шчыкетамі і жывым плотам з жоўтых акацый, дзе і начаваў. Там яго, апроч сваіх хлопцаў-студэнтаў, ніхто ня мог знайсьці.

Часта шмат думак наплывала ў душу Міхася, калі ён лежачы ў садзібе між маладых дрэвак, прышчэпляных яго ўласнаю рукою, пазіраў на цёмнае неба, усыпанае мільёнамі зорак-дыямантаў. Абмяркоўваючы і будуючы свае пляны наконт барацьбы з ворагамі-панамі, Міхась разам з тым часта ўспамінаў і свае дзіцячыя гады, поўныя розных нягод. Адзін за другім усплывалі вобразы ў яго ваабражэньні. Вось яго бацька, прыгнечаны маўчлівы панскі батрак, матка—худзенькая бязконца добрая жанчына і ядыная сястра—Зося. Яны жывуць у дваровай вялізарнай хаце, дзе вокны заклеены паперамі, заткнутыя анучамі. У хаце, заместа падлогі—сырая гліна з няроўнай паверхняю, заместа ложкаў—доўгія скрыпучыя палаткі, на сьценах і столі заўсёды вільгаць, каплі бруднае вады.. І тут-жа пораўні ў вянку адвечных дрэў стаяць белыя высокія панскія палацы. У чыстых сьветлых пакоях, залітых парфумаю, па мяккіх каберцах пахаджаюць вясёлыя здавольныя паны. З адчыненых вакон нясецца вясёлы моцны сьмех, француская мова, кволыя мэлёдыі, зыкі раяля...

Думкі і ўспаміны Міхася парушыў стук крокаў у калідоры. Адчыніліся дзьверы і ў спальню ўвайшоў досыць пажылы, гадоў пад пяцьдзесят, чалавек у новым, але простым загранічным гарнітуры. Міхась падняў галаву і паглядзеў на яго. Гэта быў дырэктар агранамічнай школы—Ян Паклонскі. Вялікі брыль яго кепкі закрываў лоб, а з пад нахмураных павіслых броў паказваліся шэрыя неспакойныя вочы. Доўгія яго вусы датыкаліся да каўнера, на якім зьбіўшыся на бок вісеў шаўковы гальштух. Рукі яго нервова трасьліся як бы чаго шукаючы. Наогул від гэтага чалавека ў той час, калі ён вайшоў у спальню, быў досыць сьмешны. Студэнты звалі яго старым дзядком (stary dziadek). Міхась кінуў на дырэктара погляд, мераючы яго ад кепкі да самых чаравік, ня мог не засьмяяцца і нават закрыў рукою рот кусаючы губу, каб не зарагатаць.

— Я чуў ад дзяжурнага па гаспадарцы, што пан захварэў і ня можа працаваць, пачаў дырэктар,—дык я прашу пана зараз ісьці да фэльчара, каб ён дасканальна абглядзеў пана і даў пісульку, адзначыўшы там, якую пан мае хваробу... Але мне здаецца, што пан ня зусім хворы, бо я прыкмеціў, ваходзячы, што пан нават чагось сьмяяўся.

Міхась, не ўстаючы, спакойна адказаў:

— Аб тым, што мне трэба ісьці да фэльчара, я ведаю сам, і вам, пан дырэктар, ня трэба было дарма турбавацца.

— То чаму-ж ня ісьці, калі ведаеце? Я вас ніяк не зразумею. Вы — самы надзвычайны дзівак! У клясе, на лекцыях польскае мовы, вы, ня гледзячы на тое, што вучыцеся больш як паўгода, ня зможаце прачытаць аднаго радка папольску; заўсёды дзесь там цэлыя ночы гуляеце, ці....

Міхась хутка ўстаў, забыўшыся, што „баліць" галава і амаль што не закрычаў, прыпыняючы дырэктара:

— Які вам інтарэс да таго, што я гуляю па вечарох?! Што-ж, вы хочаце, каб я тут у гэтых сырых мурох сядзеў заўсёды, каб ня выйшаў нават у прысады падыхаць сьвежым паветрам? Прашу пана дырэктара не глядзець на мяне як на выхаванца пансіону, альбо якойсь там гімназіі. Я ўжо не маленькі, ды й самі вы, пан дырэктар, ведаеце, што ў нас у школе нікому няма менш, як дваццаць гадоў. Што-ж датычыцца да польскае мовы, дык я і цяпер скажу вам, што ніколі пры такіх умовах я ня буду добра вывучаць яе. Вы хочаце нас апалячыць, вы хочаце нам беларусом, сілаю навязаць польскую мову, пасьля чаго зрабіць нас паслугамі паноў?! Я асабова ня супроць польскае мовы, дзеля мяне ўсё роўна, польская, расейская, беларуская ці хоць кітайская мова. А вы, вучоны чалавек, атрымаўшы асьвету ў лепшых загранічных навуковых установах, кажаце, што польская мова ёсьць самая лепшая з усіх славянскіх моваў. Вы трымаецеся шовіністычных поглядаў і рупіцеся даць іх нам. Мы ўжо даўно ўявілі ўвесь сэнс вашых фальшывых слоў на лекцыях польскае мовы, якіх вы нам даецё занадта шмат.

— А, дык вось, што я чую! — сказаў дырэктар, тузаючы нэрвова свой доўгі вус,—вы-б хацелі адзінай расейскай мовы, расейскай улады ды яшчэ можа бальшавіцкай?...

Рукі ў Міхася сьціснуліся ў моцныя кулакі.

— А вы, пан дырэктар, хочаце прымусіць мяне хацець, каб у нас, над нашай старонкай сьвісталі бізуны польскай буржуазнай улады? Ніколі! я пазіраю на кіраўніцтва паноў з агідай, я ненавіджу польскую ўладу! Разумееце вы, пан дырэктар?

Дырэктар увесь закалаціўся, як у трасцы, і нічога не сказаўшы, хутка выйшаў з спальні, моцна стукнуўшы дзьвярыма.

## II.

Маёвая раніца прыветна заглянула ў вокны школьнага будынку, залiваючы ўсё навакол яснымі праменьнямі сонца. Паміж зялёных, яшчэ вільготных лісьцяў нярухомых дрэў, варушыліся і цьвіргаталі птушкі, пералятаючы з галінкі на галінку. Пад зяленым дахам над вокнамі школьнага будынку шчабяталі і мятушыліся каля гнёздаў ластаўкі. У птушніку пелі пеўні, сакататалі куры, кулдыкалі індыкі... Раней за ўсіх у школе ўставаў дырэктар. Як і заўсёды, ён устаўшы абглядзеў усю фэрму і пераканаўшыся, што нічога шкоднага ня здарылася, сказаў старажу, каб абудзіў студэнтаў. Стораж узяў званок і пачаў званіць, падыходзячы да дзьвярэй кожнае спальні, дзе знаходзіліся студэнты. У адзін момант пасьля званка ўсе спальні заварушыліся і напоўніліся патокам вясёлага сьмеху і гоману. Студэнты адзяваліся і прыбраўшы ложкі ішлі мыцца ў умывальню, якая знаходзілася ў самым канцы памяшканьня.

Праз паўгадзіны зазьвінеў другі званок і студэнты, стукаючы дзьвярамі, пашлі доўгім ланцугом адзін за другім сьнедаць у агульную сталовую.

На школьнай фэрме ля канюшні батракі запрагалі коняй; староста

б 46663

запісваў падзённых. У сталярні і кузьні распачалася праца. Як з аднэй, так і з другой несьліся зыкі—стуканьне дошкамі і дзвынг жалеза. З боку фэрмы пыхкаў і грукацеў у млыне паравік, для якога засопшыся ўхаджаўся стары машыністы Болад. Садоўнік Шчарбовіч завіхаўся ў агарод, размахваючы лейкаю. Перад кантораю школы ён сустрэўся з двума жандарамі ў форме польскіх жаўнераў, якія тут жа і прыпынілі яго.

— Тут, у агранамічнай школе, жыве мой сябар Рудовіч Міхась,— пачаў жандар, вітаючыся з садоўнікам—дык я прашу вас, шаноўны пан, паказаць нам, гдзе знаходзіцца яго пакой.

— Выбачайце,—сказаў садоўнік,—зьвярнеце вось налева, там убачыце студэнтаў, дык яны вам і пакажуць дзе яго пакой, а мне зусім няма часу.

Жандар загарадзіў садоўніку сьцежку і прыпыніўшы яго, кланяючыся пачаў:

— Але-ж, пане, як можна вам адмовіцца? мы сягоньня едзем на фронт... мы жаўнеры, а Міхась Рудовіч наш добры сябар... Ён нам так пільна патрэбен, нават ліст да яго маем... дык калі ласка, пане, толькі пару хвілін вас гэта справа забавіць.

У гэты момант другі жандар выняў цыгары і прапанаваў закурыць садоўніку.

Апошні ня стаў больш спрачацца і павёў, нічога не здагадаўшыся, двух жандараў у пакой Міхася.

У гэты час студэнты 2-га курсу, на якім быў і Міхась, толькі што пасьнедалі і рыхтаваліся ісьці на практычныя заняткі.

Міхась няпрыкметна дзеля іншых студэнтаў, зьбіраў у клунак рэчы і рыхтаваўся зараз выбрацца ў дарогу, пехатой за Бярэзіну да бальшавікоў.

Адлегласьць ад Марына-Горкі да Бярэзіны невялікая.

Міхась спадзяваўся дайсьці да фронту пад вечар, пасьля аддыхнуць у знаёмай вёсцы і ў ночы перайсьці глухімі куткамі фронт.

Нечакана для студэнтаў адчыніліся дзьверы ў тым пакоі, дзе знаходзіўся Міхась, і ўвайшоў садоўнік, а за ім два жандары.

— Вось і сам ваш сябар Рудовіч,—сказаў садоўнік, падаючы Міхасю руку...

У адзін момант жандары навялі ў бок Міхася вінтоўкі, абвясьцілі, што ён арыштованы і адабралі ў яго рэвальвэр. У пакоі жандары зрабілі вобыск, усё перавярнулі, раскідалі...

І Міхась і студэнты, якія прысутнічалі тут, стаялі, як скамянелыя.

Толькі цяпер падмануты садоўнік здагадаўся, якіх „сяброў“ ён прывёў да Міхася. Ён памкнуўся прасіць у Міхася прабачэньня, але жандар, злосна сьмяючыся, адапхнуў вінтоўкаю беднага садоўніка, які пачаў плакаць і вышаў у калідор.

Вестка аб арышце Міхася Рудовіча абляцела ўсе куточкі школы. Усе спачувалі Міхасю, а бедны садоўнік саромяўся і нават баяўся сустракацца з студэнтамі. Усе студэнты даведаўшыся, што Міхась арыштованы, не пайшлі на заняткі, і сабраліся вялікім натоўпам на двары перад школьным будынкам. Прыйшоў дырэктар школы і абвясьціў, каб усе студэнты разышліся, але на гэта ніхто з студэнтаў не зьвярнуў увагі.

Пасьля вобыску жандары загадалі Міхасю ісьці разам з імі. Калі жандарам прыйшлося весьці Міхася, сярод студэнтаў, з боку апошніх на жандараў пасыпаліся пагрозы і гукі нездаваленьня.

Жандары разам з Міхасём дайшлі да воза, на якім павінны былі везьці Міхася ў маёнтак Дукору. Арыштованаму жандары загадалі зьмясьціцца між імі.

Міхась ускочыў на воз, зьняў сваю старую памятую шапку і пачаў гаварыць моцным узрушаным голасам:

— Дарагія браточкі! Не пажадана ні дзеля мяне, ні дзеля вас, я апынуўся ў капцюрох драпежніка-ворага, таго ворага, якога я заўсёды ненавідзеў і ненавіджу. Ня гледзячы на тое, што я маю надта мяккі, на мой погляд, характар, я ніколі ня мілаваў ворагаў-паноў, пэўна і мяне не памілуюць... Мне здаецца, я гэта адчуваю, што я вас ня ўбачу больш ніколі, што апошні раз вы чуеце мае словы... Магчыма, што мне давядзецца марнаваць дарма доўгі час у сырых варожых турмах-скляпох, а можа... можа зусім няшчадна заб'юць, мяне, як гэта ўжо зрабілі шмат з кім... Шкода мне пакідаць вас пры такіх варунках...

Даражэнькія, сябры. Пакуль я буду яшчэ жыць, мне здаецца, што вобразы аб супольным жыцьці з вамі, ніколі ня зьнікнуць у маім ваабражэньні, спадзяюся, што і ў вас застанецца хоць памяць аба мне. Працуйце яшчэ шчырэй, даражэнькія сябры! Я глыбока ўпэўнен, што промень чырвоны павінен скора асьвяціць нашу старонку, вораг-пан павінен згінуць...

Пры гэтых словах Міхася, жандар тузануў яго за рукаў і прымусіў сесьці. Міхась апынуўся пасярэдзіне двух жандараў, узброеных вінтоўкамі і рэвальвэрамі.

Жандар загадаў селяніну-фурману ехаць. Селянін заўважыў жандару, што калі на возе зьмесьціцца чатыры чалавекі, дык будзе цяжка каню. Пры гэтым жандар накінуўся на селяніна з пагрозамі і моцнай лаянкай.

Селянін, узяўшы лейцы ў рукі, сеў у перадку воза і крыкнуў на каня. Жандар пры гэтым сьцябануў каня бізуном. Конь рвануў з мейсца, і калёсыляскочучы пакаціліся па гладкай дарозе між прысадаў.

Міхась падняў угару руку, у якой трымаў шапку, і голасна крыкнуў:

— Бывайце здаровы, марына-горцы!

Больш як сотня шапак падкінулася ўгару з боку студэнтаў:

— Выбачай, дарагі сябар! жадаем табе найхутчэйшага вызваленьня!

Сьціснуты з двух бакоў жандарамі, Міхась адчуваў сябе надта дрэнна. Як толькі выехалі з школьнага двара, ён зразу пачуў сябе навекі адным. Жандары памкнуліся завесьці з ім гутарку, але Міхась ні на адно пытаньне іх нядаў адказу. Ён у глыбокім задуменьні пазіраў на далёкі небасхіл, над якім скрось расьцягнуўся доўгі сіні пасак зубчастага лесу.

Направа ад дарогі падымалася зялёная, яшчэ маладая ярына, налевагустое жыта, сярод якога былі чутны сьпевы птушак.

Густая яловая прысада, сярод якое трапілася ехаць, глуха шумела густымі цёмна-зялёнымі галінамі.

Міхась на хвілаку заслухаўся гэтым глухім знаёмым шэптам, каб адагнаць тыя неспакойныя думкі, якія агарнулі яго душу, каб адагнаць пачуцьцё безканцовай самотнасьці.

Узьехалі на роўны невялічкі ўзгорак, адкуль як на далоні была відаць уся школа: яе будова, сады, прысады і поле.

Апошні раз ён павярнуўся ў бок школы, глытаючы яе сваім поглядам...

Ніколі Міхасю школа не здавалася такою роднаю і прыгожаю, як цяпер. Знаёмыя мейсцы звалі яго да сябе, вабілі сваім хараством і ціхім спакоем. Лёгкі ветрык дыхаў з боку школы і нёс пахі, мілыя, знаёмыя Міхасю пахі...

На зялёным даху школьнага будынку Міхась заўважыў сваіх сяброў студэнтаў, якія апошні раз праводзілі яго, махаючы хустачкамі і кветкамі.

Міхась зьняў шапку, сьціснуў яе моцна ў руцэ і падняў у гару.

Хацелася вырвацца, адапхнуць гэтых жандараў, пазваць сваіх сяброў на дапамогу і распачаць самую рашучую барацьбу...

Жандары, заўважыўшы на твары Міхася ажыўленьне, яшчэ мацней прытуліліся да яго, яшчэ мацней сьціснулі яго з двух бакоў і казалі, каб ён так часта не варушыўся.

Рукі ў Міхася пры гэтым апусьціліся, на сэрцы лягло штось цяжкае, тупое; штось цьвёрдае, вялікае засела ў горле, зашчымела ў грудзёх, блізілася да вачэй і засьцілала іх густою сеткаю. Хацелася плакаць... Спусьціліся з узгорку ў лагчыну і школа паступова пачала тануць за ўзгорак, зьнікаючы з вачэй.

— Апошні раз! апошні раз!... шаптаў Міхась, пазіраючы ў бок школы.

Жандар сьцябануў каня бізуном і ён спатыкаючыся паскакаў галопам. Воз падскакаў і варочаўся з боку на бок па ўхабістай няроўнай дарозе...

Школа ўжо ўся зьнікла з вачэй, патанула за няроўнымі ўзгоркамі, прыбранымі каржакаватымі хмызьнякамі.

На душы Міхася было нудна, а навакол у моры зялёнага жыта пелі вясёлыя птушкі; на дарозе цьвілі кветкі, вядучы гутарку з матылькамі і працавітымі пчоламі.

## III.

Суд над Міхасём быў утвораны, разам з іншымі ўдзельнікамі атраду паўстанцаў, 15-га траўня ў маёнтку Дукоры. Міхась на судзе трымаў сябе так сьмела, што самі палякі былі зьдзіўлены. У той час, як над іншымі арыштаванымі жандары ўтваралі розныя нечалавечыя зьдзекі: білі і зьвязвалі калючым дротам, калолі голкамі, палілі пальцы і г. д., Міхася нават не кранулі. Калі пасьля пяцёхгадзіннага выпыту Міхасю далі апошняе слова, ён сказаў:

Я вораг панскае улады. Пачаў ненавідзець паноў яшчэ змалку, як навучыўся гаварыць. Поглядаў сваіх не зьмяняю і ніколі не зьмяню. Зьлітаваньня не хачу атрымаць з панскае ласкі. Больш нічога ня маю сказаць.

Пасьля двухгадзіннай нарады,—старшыня суду пачаў чытаць пастанову. Утварылася магільная цішыня, толькі голас старшыні адбіваўся рэхам у змрочным пакою суда. На тварох шмат у каго з падсудных здрыгвалі мускулы.

Міхась досыць спакойна пазіраў на старшыню і калі пачулася, што начальнік партызанскага атраду паўстанцаў Міхась Рудовіч прысуджаецца да растрэлу.... сказаў:

— Я ужо даўно знаў аб гэтым! — І хацеў засьмяяцца, але губы зрабіліся чамусь упартымі, заскакалі самі сабою і скрывіліся у зусім непажаданую грымасу.

Міхась сярдзіты сам на сябе за страту самаўладаньня прыцягнуў непаслушную губу да зубоў, прыкусіў яе і заместа бледнасьці у яго ад сораму твар заліўся чырвоным колерам. Адзінаццаць чалавек было прысуджана да растрэлу, а некаторыя засуджаны у катаргу на розныя тэрміны. Пры апошніх словах старшыні суду, асуджаныя на сьмерць засьпелі пахаронны марш.

Справа закончылася ужо раніцаю, і усіх асуджаных разьмясьцілі у розных кутках вільготнага склепу.

Пастанова суду павінна была выканацца раніцаю на другі дзень. У склепе было так цёмна, што нельга было разгледзець адзін другога.

— Ах, хаця-б нагледзецца на прыроду, на сьвет!—уздыхаў нехта у вільготным кутку склепу.

— Табе глупства на ўме,—заўважыў ахрыпшы голас,— вось я пакінуў жонку, пару дзетак у чужой хаце, бяз сродак, так сказаць, на ветры... Вось і баліць мне сэрца па іх, ные... Здаецца так бы лёгка было, каб апошні раз моцна-моцна прыхіліць і пацалаваць сваіх дзетак-сіротак. Яначка, Зіна, і ты Кася! Што вы робіце цяпер, ці ведаеце, што заўтра мяне павядуць на страту? Дзе вашы думкі?—Апошнія словы былі выказаны праз плач.

— Плакаць і ўздыхаць, сябры, зусім не належыць,—пачуўся спакойны голас Міхася,—які-б жаль нас не агортваў, мы не павінны паказаць сваім ворагам, што наша сьмерць балюча адаб'ецца на нашых родных. Я спадзяюся, што мы ўсе сьмела сустрэнем варожыя кулі. Плач ні ў якім разе нічога нам не дапаможа і толькі пакажа ворагам, што мы баязьлівыя, як авечкі, якіх прывезьлі рэзаць на бойню. Нас кожнага трывожаць думкі аб тым, што мы пакідаем сваіх родных і наогул усіх працоўных на зьдзекі ворагам. Але няўжо ў нас няма хоць часткі надзеі на тое, што прыдуць нашы родныя браты-камуністы з усходу, вызваляць нашу старонку ад уціску паноў і зьвернуць увагу на нашы асірацелыя пакрыўджаныя сем'і? Я ўпэўнен, што праз некалькі дзён, панскае нахлыньнё разьбяжыцца пад націскам чырвоных барацьбітоў...

Міхась гаварыў доўга, і ўсе яго слухалі з вялікім зацікаўленьнем.

Асуджаныя на сьмерць ня спалі пасьля суду, аж да апошнае раніцы свайго жыцьця. Міхась пры ўсім сваім жаданьні ня мог заснуць і ўсю ноч перад ім насіліся вобразы яго ранейшага жыцьця. Гэтыя вобразы доўгім ланцугом чапляліся адзін за адным, беглі па няроўнай паверхні, спатыкаючыся і датыкаліся да апошняга вобразу,—растрэлу. Тут ланцуг ранейшых вобразаў рваўся на часткі і заместа яго, як волат ад неба да зямлі, маляваўся адзін вобраз сьмерці...

У дзьве з паловай гадзіны раніцы, на двары пачуўся гоман і загрукацелі дзьверы. У сыры склеп кінуўся промень сьвятла і пачуліся цяжкія крокі. Прышлі ўзброеныя жандары і загадалі ўсім выходзіць з вільготных куткоў склепу. Зрабілі перакліканьне і пачалі ўсім вязаць рукі дротам.

Дайшла чарга да Міхася.

— Я не ўцяку і прашу не завязваць мне рук,—сказаў Міхась. Два жандары накінуліся на яго і пачалі вязаць рукі, але паручнік, заўважыўшы гэта, не дазволіў жандарам зьвязаць рукі Міхасю, і ён толькі адзін застаўся з незавязанымі рукамі:

Адзінаццаць паўстанцаў, асуджаных на сьмерць, павялі ў хваёвы няпрыветны хмызьняк, які знаходзіўся ад маёнтку ў адлегласьці ня больш як паўвярсты. Наперадзе ехаў малады польскі паручнік, а за ім ішлі засуджаныя на сьмерць паўстанцы, абкружаныя густым колам злосных жандараў і жаўнераў.

Як толькі Міхась заўважыў, падыходзячы да хмызьняка жоўты пясок і яму, дзе праз колькі хвілін давядзецца ляжаць забітым, сэрца яго забілася так моцна, што, здаецца, хацела вырвацца і кудысь паляцець далёка-далёка. Ён пачаў адчуваць, што кроў яго зьбіраецца з усяго цела, цячэ ўніз, імкнецца схавацца сярод роснае травы. Усё перад ім заскакала і забегала завучы да сябе, а хмуры хмызьняк, у якім цырыхкалі нясьмела птушкі, зрабіўся страшным, халодна-варожым. Зямля бегла з пад ног і часамі яму здавалася, што ён ляціць у глыбокае бяздоньне.

Міхась схваціўся рукамі за грудзі, апусьціў твар уніз, паменшыўшы крокі прызастаўся з заду, дзеля таго, каб сябры не заўважылі яго ўзрушэньня. Але праз колькі хвілін пачаў зноў уладаць сабою і цьвёрдымі крокамі пайшоў наперад. Падняўшы вочы на сваіх сяброў Міхась заў-

важыў, што ўва ўсіх твары былі бледныя, вочы бліскучыя... А паручнік і жаунеры панурыя, бяз конца варожыя, сьляпыя прылады сьмерці, былі спакойныя. Вось і яма. Вузкая, цёмна-глыбокая, страшная. На адным баку яе—жоўты пясок, на другім—стоптаная паніклая трава.

Міхась першы шырокімі крокамі падышоў да ямы і стаў на самым яе краі. Жаўнеры штурхаючы прыкладамі вінтовак зьвязаных людзей, ставілі іх у адзін шэраг тварам да ямы.

— Мы ня будзем станавіцца тварам да ямы, дазвольце, пан паручнік, нам стаць так, як мы хочам,—сказаў моцна Міхась. На бледным твары паручніка заскакала кароткая ўсьмешка, і ён даў сваю згоду.

Пасьля гэтага Міхась пачуў у сабе яшчэ больш прыліў энэргіі, зрабіўся сьмелым і бадзёрым. Гэты паручнік здаваўся яму маленькім хлопчыкам, а жаўнеры мізэрнымі валавянымі лялькамі.

Сябры! мы паміраем за вызваленьне працоўнага народу,—пачаў Міхась,—мы паміраем ня першыя і пэўна не апошнія. Памром горда, бязбоязна, як і належыць паміраць камуністам. Паглядзеце на ўсход, туды, дзе чырваньню афарбована неба, там скора выплыве сонца, а сьледам за ім з гэтага самага ўсходу густымі шэрагамі будуць ісьці на нашу зямельку пад чырвонымі сьцягамі вызваліцелі беларускага працоўнага люду...

Жаунеры сталі ў шэраг і чакалі загаду паручніка, трымаючы ў руках халодныя вінтоўкі.

Паручнік круцячыся на сытым кані, пачаў падаваць каманду. Жаўнеры, як адзін, паднялі вінтоўкі на рукі і нацэліліся...

Паўстанцы запелі па знаку дадзенаму Міхасём:

„Мы дружна паўстанем,
З касамі, з сярпамі,
Прагонім зямлі палачоў,
Няхай“...

Паручнік моцна махнуўшы рукою падаў жаўнерам каманду страляць.

Забахкалі выстралы.. Конь, на якім сядзеў паручнік, мятнуўся ў бок. Ён ледзьве ўтрымаўся на кані і выцяўшы яго бізуном, моцна вылаяўся.

Адзінаццаць барацьбітоў-кэмуністаў кінулася ў жарло цёмнае ямы, паліваючы крывёю жоўты пясок...

Узышло сонца, заліваючы праменьнямі верхавіны дрэў хмызьняку. У полі над зялёным збожжам шчабяталі птушкі, як бы сьпяваючы гымны славы сьмелым барацьбітом, загінуўшым ад варожых рук, за вызваленьне прыгнечанага люду.

Ня прайшло і двух месяцаў пасьля растрэлу паўстанцаў-камуністаў, як палякі пад моцным націскам бальшавікоў рушылі назад, а за імі сьледам усе беларускія паны-маёнтнікі, купцы і фабрыканты. Уся Беларусь звольнілася ад панскага ўладаньня...

Міхась і ўсе камуністы, растрэляныя разам з ім, былі адкопаны і ўрачыста перанесены ў вёску Пярэжыр, дзе іх пахавалі ў агульнай магіле і пабудавалі на сродкі мясцовых сялян помнік.

Студэнты Марына-Горскага сельска-гаспадарчага тэхнікуму ушанавалі памяць свайго сябра-камуніста Міхася Рудовіча тым, што ўтварылі пры тэхнікуме каштоўную бібліатэку яго імя, якая кожны год значна пашыраецца. У памяшканьні бібліатэкі вісіць яго партрэт, абвіты заўсёды сьвежаю зелянінаю і кветкамі.

Дзень растрэлу Міхася Рудовіча—17-га траўня, для студэнтаў Марына-Горскага тэхнікуму зьяўляецца днём жалобы.

**А. Вечар**

# Песьні ў Кастрычніку.

I.

Іграйце трывогу на трубах, вятры!
Хай звоняць агнямі пад сонцам клярнэты,
Хай чуюць наш заклік ня два і ня тры,
А тысячы раз і бяз конца плянэты.

І неба гудзе хай як той барабан
І месяц рассыплецца срэбрам на флейтах...
Трывогу, вятры!
Барацьба! Барацьба!
Была ўжо калісьці і будзе далей так
За шчасьце і волю рабам.

Ідзе барацьба бяз крыві і з крывёю
То простай дарогай то сьцежкай крывою.
Трывогу! Трывогу!
Ў палёх і між гор
Хай гукі імчацца ад краю да краю
Над куляй зямною ня дзікаю зграяй,
А крокам шырокім кагорт.

Хто можа сказаць нам сурова: „ня сьмець"!.
Жыцьцё мы нясём, а ня чорную сьмерць,
Бязьмежныя думы Сусьвету нясём мы
Ня заўтра, а сёньня!

Пад сіняю блузай і зрэбнаю сьвіткай
Ёсьць вольнае сэрца і сьлед ад пакуты;
Ні залатою ні срэбнаю ніткай
Адчуваньні ня скуты.

Іграйце-ж трывогу, хай чуюць усе
Латунныя гукі сусьветнай фанфары.
Няхай упадуць на пажоўклым аўсе
Дажджом залатыя хмары.

II.

Што ні год,
то месяцаў дванаццаць
адзьвіняць гадзінамі у поўнач.
Не дагнаць іх людзям і ня ўгнацца,
хоць жыцьця і поўна!

І зямля над сонцам раз абойдзе,
раз абойдзе,
а стаяць—ні разу.
Будзе гразь і будзе сьветлы гоўдзень,
будзе радасьць, будзе і абраза.

Што ні год,
калі мінае стрэлка
на гадзіньніку прыроды восем,
восень ходзіць;
абрывае ветрам
і ў паветры носіць
лісьце восень.

Не, ня лісьце сёньня восень гоніць!
У крыві,
як у чырвонай фарбе,
з пальцамі далоні
сыплюць клёны
без праклёну і бяз скаргі.

Восень, восень,
хто цябе паклікаў
усьцілаць зямлю лісьця касьцямі?
Ў барацьбе з нягодаю вялікай
гнуцца дрэвы,
нахіляюць сьцягі,
нахіляюць сьцягі самі.

Хай нахіляць,
хай апусьцяць сонна
па-над краем коўдраю іржавай....
Дзе краіна-пусьцеч
там нясём мы
сьцяг працоўных
над сваёй дзяржавай.

Што ні год,
калі мінае стрэлка
на гадзіньніку прыроды восем
восень ходзіць;
абрывае ветрам
і ў паветры носіць
лісьце восень.

Што ні восень,
над зямною куляй
у Кастрычніку змаганьня крыльлі.
Не залесьці трутням
к нам у вулей,
бо чырвоныя, як сонца ўраньні,
вуліцу сьцягі накрылі.

**Ю. Гаўрук**

# Стары матрос

(урывак з апавяданьня)

...Былі цёмныя хвіліны надвячорку, галадалі людзі ў безрабоцьці, шырылі зрэнкі ў шуканьнях, а калі наведаўся дзень, стары матрос пашоў служыць сторажам на рачной прыстані.

Падмятаў сходцы бярозавым веньцем шэсьць гадоў, столькі-ж сама чапляў замкі на скрыні і пільнаваў вароты для людзкіх падарожжаў, і ня мог ён спасьцігнуць навукі забываць шэсьць гадоў.

Гаварыў ён:

— Грэх крыўдзіцца, хлеб таксама сытны, а да хлебу вось цэлая рака вады. Целам чысты, мыюся. Чужога сьмяцьця многа, але-ж зноў—насіць ня трэба. Пунька чыстая, сяньнік чысты. Жыву сам-на-сам і нікога не сустракаю. Да мяне прыходзяць тыя, што ў ад'езд, а прыязджаць—ніхто не прыязджае, каб даведацца як я жыву.
У мяне сын загінуў..

Адцягвалі рукі аж да ботаў шырокія плечы матроса, і хмурнеў задуменны твар пры гэтых словах.

— Гордага сына меў. Куды, ці гэта людзі бягуць вунь там вулачкаю?—не пазнаю іх. Чуеце, цьвіркаюць на свае кішэнькі ды клопаты, а любасьць выдумваюць. Не рабіў я гэтага ніколі. Ён быў памочнікам капітана і лепшы за мяне. Можа скажаце ад бацькі здольнасьці якія прышліся? Увесь век мяшкі цягаў бацька.

Тады, калываючыся, садзіўся матрос на прыступачку, клаў венік да сябе тронкам, а духам перакідаўся на другі бок ракі.

— Прасякаў дарогу, ня глядзеў назад, ня мірыўся ён, што цьвіце непатрэбшчына, нуды не пераносіў. Казаў, калі выжыву, будзе па мойму, цябе тады ўсякі дагледзіць, бо ты гэрой працы, а твой сын—гэрой грамадзянскай вайны.
На рубцы як стане, усюды відаць белую шапку. Голасам гудок перамагаў. Нешчасьлівая воля! Пахаваўся ў моры ад міны. А я не хачу каб даглядалі і трымаюся на прыстані. Харошы параход быў, а што ворагам да харошага?
Золата маё высыпалася, бражджу вось як парожні гаршчок.

Ён стукаў сябе ў грудзі і кашляў.

— Хадзіў па стэпах, а прывалокся да вады, лягчэй тут боль чуць.. Цячэ рака ў тое мора, дзе сын. Памагаю яму шукаць праўды.

Вецер віў рэдкія валасы.

Узьнятыя вочы матроса жаўцелі.

**А. Аляксеяў**

# Напярэдадні

Не спадзяваліся гады вякамі мерыць,
Здавалася: пыліначка-зямля
Спакон вякоў і па сівую небыць,
Аднэй орбіце жаху будзе верыць,
Адзін ганебны пройдзе шлях.

З няпомнай даўнасьці па часу бліжні гон
Казалі нам правадыры-прарокі—
Пануе над усім такі адзін закон:
Нявольнік і ўладар адным сыйдуцца крокам
Ў часіну новых лепшых дзён.

Але ў грудзёх, загартаваных працай,
Даўно нам розум іскру захаваў,
Што ўласнаю рукой за долю трэба брацца,
Што трэба працаваць нам і змагацца,
Што праца—ўладар усіх жыцьцёвых спраў.

Сталёвы зашугаў зямным абшарам звон,
Заварушыліся усе краі сусьвету,
Дзіцячай лялькаю зьлятеў за тронам трон;
Ў краіне нашай, бураю сагрэтай,
Ўладаць чырвоны стаў закон.

Імкненьне дзён глынула даль вякоў,
Нам кожны год цяпер шырэй стагодьдзя,
Станок жыцьця нам з новых тчэ асноў
Краіну сьветлую, якая пойдзе, пойдзе
Бяз цьмянай жудасьці і цяжкіх ланцугоў.

Яшчэ маўчыць труба апошняга змаганьня,
Пяць шостых сьвету звоняць гулам коў,
Але няма ніякага ваганьня,
Калі ўзышлі-стаім на рубяжы вякоў
Мы напярэдадні сусьветнага паўстаньня.



**Ўл. Ул. Прыбыткоўскі**

* * *

Мысьлі нашай
вялікі стаж!
Дзесяцігадовы марш!
Дзясяты раз
прычыну
перамогі
зваж—
„Комуністычную заразу“.
Ні самалёт,
ні газ,
ні танк,
ні інтэрвенцыі,
ні голад—
ім не зрабіць
нас паслухмянымі
камандзе: „стань“!
За стаж і марш
мы навучыліся
трымаць галовы свае
горда!
„Комуністычная зараза“!!
...і зоры вольныя
заіскрыліся
ў комінах сяла.
Стыхіі
адбываць
ідуць
намазы
прад чалавекам—
—дойлідам сьвятла.
„Комуністычная зараза“,
ты сілу любую
ў істоце чорнай завіла,
і сілай той
засерабрыліся пералазы
ў ясьнейшае
жыцьцё сьвятла.



# Наша грамадзкасьць

П. Кандрацько і В. О. Гурэвіч

## Акадэмія—шэф над вёскай

Шэфства, якое пачалося яшчэ з 1922 году па ініцыятыве партыі згодна заветаў Ільліча, у нашай Беларускай Акадэміі С. Г., ўсё больш і больш пераходзіць у моцны рух нашае грамадзкасьці ў справе дапамогі сацыялістычнаму будаўніцтву ў вёсцы.

Уся работа шэфтаварыства, пачынаючы з 1922 г. якая выяўляецца ў арганізацыйна-гаспадарчай дапамозе, вядзецца ў плянавым парадку пад кіраўніцтвам ячэйкі КП(б)Б Акадэміі і заўсёды адпавядае мясцовым запатрабаваньням сялянства.

Культурная і гаспадарчая адсталасьць зьяўлялася тыповай для сялянства нашага раёну. За гэты час, апроч масавай сыстэматычнай працы ў вёсках, с.-г. гуртках, праведзена 20 каротка-тэрміновых (2-4 тыдні) с.-г. курсаў у вёсках, канфэрэнцыі і экскурсыі сялян у Акадэмію (а раней у Інстытут), аднадзённыя с. г. выстаўкі-абозы на кірмашох, аграсуды, прымалі удзел у раёных і акруговых выстаўках. Больш 700 дзяцей працуе ў 16 дзіцячых с.-г. клюбах пры піанэратрадах. Праца іх праводзіцца па гародніцтву, садоўніцтву і жывёлагадоўлі на каляктыўных вучастках і ў сваіх гаспадарках. Кожнаму удзельніку клюбу даецца некалькі заданьняў практычных, якія ён праводзіць у сваей гаспадарцы пад кіраўніцтвам студэнтаў-шэфаў.

Уся гэта праца дала добрыя вынікі, аб чым сьведчаць водгукі сялян, як у друку, на канфэрэнцыях, так і ў лістох, якія прысылалі ў шэфтаварыства. Перавялі дарэмна на шматпольле за гэты час

| Гады | 1922 | 1923 | 1924 | 1925 | 1926/27 | Разам |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Плошча ў дзес. | 00 | 75 | 1200 | 1800 | 2771 | 5846 |

і ня менш гэтага пераведзена студэнтамі за плату.

Увядзеньне шматпольных севазваротаў значна пашырыла плошчу кармавых і тэхнічных расьлін, павысіла ўраджаі ўсіх культур, у тым ліку і збожжа, і дало магчымасьць рацыянальна скарыстаць угнаеньні: штучныя і гной.

Праводзілася паказальнае кармленьне кароў і гадаваньне цялят у сялян; гэта паказала сялянам як гадаваць скаціну.

Нямала заложана садовых выхавальнікаў і школак.

Арганізаваны і інструктуюцца машынныя, мэліарацыйныя, малочнасыраварныя і інш. с. г. таварыствы, якія апроч эканамічнай выгады, узмацняюць сацыялістычныя элямэнты ў вёсцы.

Вялікая праца праведзена па паляпшэньню сенажаці па культуртэхніцы і земляўпарадкаваньню. Наогул сяляне добра зразумелі, што шэфы нясуць у вёску не „гасьцінцы“, а свае веды, каб стварыць моцнае яднаньне навукі і працы.

Апрача таго вядзецца арганізацыйна-грамадзкая дапамога ў хатахчытальнях, К.С.У.Д., саветах і камісіях пры іх, увязваючы сваю працу з іншымі грамадзкімі і савецкімі установамі.

У XI год Кастр. Рэвалюцыі кожны шэф яшчэ лепш павінен уявіць сваю аснаўную задачу і чым больш ён будзе зьвязываць з ёю выкон-

ваньне кожнага канкрэтнага заданьня ў вёсцы, чым больш студэнт будзе аддаваць увагі арганізацыйна-гаспадарчай дапамозе вёсцы, зьвязанай з перабудовай яе эканамічнага укладу, тым шырэй і глыбей будзе вялікае шэфства.

Шэф ня толькі культурнік, шэф ня толькі дапамагае селяніну ва ўсякай культурнай і грамадзка-арганізацыйна-гаспадарчай справе, але і будаўнік новай сацыялістычнай вёскі.

**К. Шведко**

# Дасягненьні падшэфнага Дрыбінскага раёну

Сацыялістычнае будаўніцтва Дрыбінскага раёну назіраецца ў наступным:

1) Зьнішчан бандытызм. З пачатку імпэрыялістычнай вайны, дзякуючы вялікім лясом, у раёне завялося шмат бандытаў, якія грабавалі і рабілі забойствы. Нават на самае мястэчка Дрыбін было зроблена 2 налёты. Цяпер у Дрыбінскім раёне спакойна.

2) Земляўпарадкавана $^1/_5$ частка раёну. Да вайны была земляўпарадкована толькі $^1/_9$ частка з пераходам на сталыпінскія хутары. Апошнія 4 гады працуюць па 3 альбо 4 земляўпарадкаваўчых партыі. Узят кірунак пасялковага землябудаўніцтва з колькасьцю 10 — 15 двароў у пасёлку.

Такіх пасёлкаў налічваецца каля 40, прычым амаль што ўва ўсіх пасёлках уведзен шматпольны севазварот. Праца па пераводу на шматпольле праводзілася дарэмна сіламі мясцовых аграпрацаўнікоў і нашым шэфтаварыствам.

Хутаране, бачачы карысьць ад шматпольля, таксама пераходзяць да палепшаных спосабаў землякарыстаньня ня гледзячы на тое, што ім прыходзіцца плаціць ад 50 да 75 кап. з дзесяціны. Абгляд паказаў, што ўведзены севазварот на 75% гаспадарамі выконваецца. Усяго ў раёне пераведзена на шматпольле больш 700 дзесяцін.

3) Дасьледча-паказальная праца значна разгорнута. За апошнія гады праведзена 5 с.-г. выставак пры частковай дапамозе шэфтаварыства Акадэміі. Сялянскія гаспадаркі і камуна „Хлеб і Воля" прымалі ўдзел ўва усебеларускім конкурсе 1926 г. і атрымалі прэміі. Вядзецца дасьледча-паказальная праца, як Акадэмічнай фэрмай Дрыбін з папарамі, так і мясцовымі аграпрацаўнікамі са штучнымі і сідэрацыйнымі ўгнаеньнямі. Гэтая праца павялічыла зацікаўленнасьць насельніцтва да гэтых угнаеньняў.

4) У жывёлагадоўлі назіраецца палепшаньне адбору і кармленьня, але-ж недахоп у вытворніках-быкох значна адчуваецца.

5) Лясная гаспадарка будучы вучэбным лясьніцтвам Акадэміі прыступіла з мінулага году да засеву малых масіваў. У мінулым годзе засеяна каля 100 дзес. і ў гэтым годзе каля 150 дз.

6) Каапэрацыя хутка пашыраецца асабліва мэліарацыйная; за апошнія 2 гады зарганізавалася 16 мэліар. таварыстваў. Апроч таго 2 малочна-сыраварных, 1 жывёлаводнае і 1 агнетрывалага будаўніцтва — т-вы. Існуе спажывецкае т-ва, якое цяпер адчыніла 3 аддзяленьні па раёну, і с.-г. каапэрацыйнае т-ва.

7) Калякты́ўная апрацоўка зямлі праводзіцца ў камуне і 4-х с.-гасп. арцелях.

8) за апошнія 3 гады шмат пабудована будынкаў і мастоў вялізарнага значэньня для раёну. Акадэмічная фэрма Дрыбін пабудавала паказальны двор для жывёлы.

Усе гэтыя дасягненьні к 10-ай гадавіне зроблены пры ідэёвай дапамозе шэфа—С.-Г. Акадэміі імя Кастрычніковай рэвалюцыі, якой сялянства жадае яшчэ большага разьвіцьця ў далейшым на карысьць усяму сялянству Беларусі.

**П. І. Жук**

## Праца па ваенізацыі

Працоўныя масы Савецкага Саюзу ніколі ня былі ўведзены ў аблуду міралюбівымі прамовамі „пацыфістых“ розных адценьняў на захадзе. Зразумела дзеля ўсіх, што імпэрыялісты нам вайну рыхтуюць і што пацыфістскія прамовы ім патрэбны дзеля прыкрыцьця ўзбраеньняў, якія вядуцца па-за кулісамі. У апошнія часы мы ўжо бачым, што падрыхтоўка нападу на наш Саюз прыймае ўсё больш і больш канкрэтныя формы. Аб гэтым сьведчыць цэлы шэраг бандыцкіх нападаў на нашы прадстаўніцтвы, забойства т. Вайкова, разрыў з намі адносін Англіі, апошняя кампанія за разрыў у Францыі і друг.

Як рэагавала на ўсё гэта савецкая грамадзкасьць? Яна імкнулася да пашырэньня ідэй абароны ў шырокіх колах працоўных. Падрыхтоўка к абароне вялася і вядзецца па дзьвюх галінах: з аднаго боку Чырвоная Армія, а з другога—розныя грамадзкія арганізацыі, як напр. Асоавіяхім, які налічвае ў сваіх шэрагах міліёны сяброў. Асноўныя фактары ў працы Асоавіяхіму: 1) уцягненьне ў справу абароны ўсіх працоўных Савецкага Саюзу, 2) тэхніка, якой павінна ўступіць месца старое „шапкамі закідаем“ і 3) падрыхтоўка меткага стралка. Пэрыяд „перадышкі“ павінен быць скарыстаны поўнасьцю.

Калі кінуць рэтраспэктыўны погляд на прароблену працу Акадэмічнай ячэйкай Асоавіяхіму, якая налічвае да 900 сябааў, то можна убачыць, што зроблена многа, асабліва па ўкараненьню ідэй абароны ў сялянскія масы. Сама Акадэмічная ячэйка зарганізавалася ў 1924 годзе і праз увесь час існаваньня вяло працу галоўным чынам на вёсцы. Зарганізаваны па Горацкаму раёну 34 ячэйкі Асоавіяхіму, якія абслугоўваліся Акадэмічнай ячэйкай шляхам пасыланьня працаўнікоў з дакладамі, праэкцыйным ліхтаром, хімперасоўкамі і г. д. Апошні год у шэрагу вёсак пратручана насеньня ад галаўні 620 пудоў. Заложана 10 паказальных вучасткаў з мінэральнымі ўгнаеньнямі.

Пабудованы летні цір, дзе штодзенна праводзіцца стральба. Праведзеныя ў летні час тры стралковых спаборніцтвы на лепшага стралка з удзелам жанчын і кампаніі па зебру сродкаў на пабудову самалётаў у імя Войкава і „наш адказ Чэмбэрлену“ высунулі Акадэмічную ячэйку Асоавіяхіму на адно з першых месц у БССР. Усяго сабрана 860 рублеў.

Пры ячэйцы створаны цэлы шэраг гурткоў, як напрыклад, стралковы, хэмічны, санітарны, вайскова-інжынерны, сельска-гаспадарчы, дасьледчы і др. З усіх гурткоў складаецца адна баявая адзінка—батальён. Цераз гурткі ячэйка імкнецца пашырыць веды па розных галінах сваіх сяброў і тым самым стварыць кадр добра падрыхтаваных байцоў к забароне заваёў Кастрычнікавай Рэвалюцыі.

**Адказны рэдактар: Рэдакцыйная Калегія**